Пралетары: усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 м. — 2 р. 70 к. На 6 м. — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: мінгарадзкія — 20 к. масковы — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шматрэдкі тэксту — р. 50 к. За радок шматрэдкі пасьля тэксту 1 р. — к. За радок шматрэдкі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зьвыш гэтага 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент 25 к. За кожны дадатковы 15 к. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент 15 к. За кожны дадатковы 5 к. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Белгосстраха Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 117 (2606) Нядзеля, 26-га мая 1929 г.

Дапаможам арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва ў вёсцы.

Скора будзе 2 месяцы, як апубліказана палажэньне пра конкурс на лепшы па сельскай гаспадарцы раён. Рэзалюцыя пленуму ЦК КП(б)Б, які адбыўся у красавіку, па пытаньню аб веснавой пасяўной кампаніі, дала выразную дырэктыву акруговым і раённым арганізацыям аб скарыстаньні веснавой пасеўнай кампаніі для падрыхтоўкі сялянства да конкурсу на лепшы сельска-гаспадарчы раён. Адозва XVI партканфэрэнцыі па пытаньні аб сацыялістычным спаборніцтве таксама дае пэўныя ўстаноўкі адносна разгортваньня гэтага спаборніцтва ў вёсцы.

Ня гледзячы на гэта, справа сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы вначна адстае. Калі горад да гэтага часу даў каштоўныя прыклады аддана працы рабочых калектываў, дык у вёсцы пакуль што такіх прыкладаў мы яшчэ ня маем. Нават сацыялістычны сэктар вёскі (савгасы, калгасы) і то абмежаваўся толькі паасобнымі выклікамі на сацыялістычнае спаборніцтва. Шырокай хвалі рабочых савгасаў і сяброў калектываў, якія павінны прыняць удзел у спаборніцтве, мы яшчэ ня бачым.

Усебеларускі конкурс на лепшы па сельскай гаспадарцы раён—адна з форм сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы. Пры дапамозе конкурсу праца па сацыялістычным спаборніцтве набывае больш плянавы характар: у гэту працу ўцягваюцца ўсе гаспадаркі раёну, а таксама арганізацыі і ўстановы. Конкурс дапамагае з самага пачатку накіраваць спаборніцтва па належным логву, папярэджвае магчымасьць бюракратычнага скажэньня ідэі сацыялістычнага спаборніцтва, калі справа абмяжоўваецца парай выклікаў, і на гэтым усе супакойваюцца. Арганізуючая роля конкурсу надзвычайна вялікая. Таму ён павінен выклікаць найвялікшую ўвагу як шырокіх колаў сялянства, так партыйных і савецкіх арганізацый і ўстаноў на вёсцы.

Аднак, на справе мы бачым зусім адваротнае. Сялянства, якое ўжо даведалася пра конкурс, вельмі цікавіцца ім і ўносіць свае прапановы. Раённыя і акруговыя арганізацыі і ўстановы да гэтага часу нічога ня робяць у справе разгортваньня працы па конкурсу.

Да 1 чэрвеня трэба было правесьці наступную працу: **абмеркаваць пытаньне аб конкурсе на ўсіх сялянскіх сходах і пленумах сельсаветаў.** Райвыканкомы павінны былі на аснове гэтага абмеркаваньня прыняць свае пастановы і даць пэўныя заяўкі ў акругі. Ні тое, ні другое яшчэ ня зроблена. Па Полацкай акрузе, напрыклад, толькі адзін райён выказаў жаданьне прыняць удзел у конкурсе. Па іншых акругах справа таксама ня лепш.

Такое становішча перш-на-перш гаворыць аб тым, што ідэя сацыялістычнага спаборніцтва не перанесена ў сялянскія масы. Гэта ідэя пад націскам канцэлярый акруговых і раённых установаў не атрымала належнага разьвіцьця і практычнага адбітку на працы.

Самае характэрнае тое, што непасрэдную арганізацыю конкурсу павінен праводзіць зямельны апарат, а апошні, між іншым, нічога дагэтуль не зрабіў. Гэты прыклад характарызуе, наколькі зямельны апарат у нас непаваротлівы, ня гібкі, а часамі проста нікуды ня годны.

Самы лепшы час падрыхтоўкі да конкурсу ўжо ўпушчан. Веснавая сяўба заканчваецца. Дырэктывы партыйных і савецкіх установаў у справе арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы нявыкананы.

Установы, якім гэта належыць, павінны высьветліць прычыны, а таксама—хто ў гэтай справе вінават.

Адначасова трэба тэрмінова, не чакаючы ніводнага дня, правесьці на вёсках шырокае растлумачэньне аб важнасьці сацыялістычнага спаборніцтва і аб конкурсе, як адным з відаў гэтага спаборніцтва.

Сельсаветы і РВК тэрмінова павінны абмеркаваць пытаньне аб удзеле ў конкурсе, а таксама даць належныя заяўкі ў акругі. Падрыхтоўку да асенняй сяўбы неабходна поўнасьцю скарыстаць для разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва ў вёсцы.

Вышэй мы казалі што ў сацыялістычным спаборніцтве горад далёка абагнаў вёску. Вёска адстала і адстала не таму, што сяляне ня хочуць удзельнічаць у спаборніцтве, а таму, што мы ня ўмеем яго арганізоўваць. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі, шэфарганізацыі і ўся савецкая грамадзкасьць—на дапамогу арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў вёсцы.

Вёска не павінна ў гэтай справе адставаць ад пралетарскага гораду!

За гандлёвыя зносіны з СССР.

Румынскія купцы патрабуюць гандлёвых зносін з СССР

ВЕНА, 24-V. Румынская газэта „Дымініяца» паведамляе, што гэтымі днямі дэлегацыя бэсарабскіх купцоў наведала міністра гандлю і прамысловасьці і прасіла яго дабіцца ў магчымма кароткі тэрмін аднаўленьня гандлёвых зносін з СССР. Водгук слоў газэты, у сувязі з гэтым міністэрства замежных спраў пастанавіла паслаць свайго дэлегата для ўдзелу ў пасяджэньнях савецка-румынскай цэнтральнай камісіі, якія пачынаюцца 15-га чэрвеня ў Бендэрах. У палітычных колах ходзяць чуткі, што пытаньне аб аднаўленьні гандлёвых зносін з СССР будзе пастаўлена ў парадак дня пасяджэньняў камісіі.

Нават Джойнсон Хікс ня ўтрымаўся на пазіцыях

ЛЁНДАН, 24-V. Джойнсон Хікс, выступаючы ў Бэтфордзе, заявіў: „Урад гатоў аднавіць гандлёвыя і дыплёматычныя зносіны ў любы момант, калі Расея пажадае прысьці да нас з такімі-ж сумленнымі мэтамі і з такою-ж прыязнью, якія выяўляюць у Лёндане Францыя і Нямеччына. Дзьверы для Расеі адчынены. Мы купляем ў Расеі больш, чым яна купляе ў нас".

За пашырэньне савецка-эстонскіх перамоў.

РЭВЕЛЬ, 24-V. У гутарцы з прадстаўнікамі друку эстонскі міністр замежных спраў Латык даў падрабязную характарыстыку ўтворанаму між СССР і Эстоніяй гандлёваму ўгавору. Падкрэсьліваючы, што ў аснову ўгавору пакладзен прынцып найбольшага спрыяньня і што ён рэгулюе працу гандлёвага прадстаўніцтва і іншых гаспадарчых органаў СССР, міністр зазначыў на спэцыяльнае значэньне артыкулаў угавору наконт чыгуначнага транспарту праз Эстонію і СССР. Орган аграрыяў «Кайя» далучаецца да пажаданьня „Известий" аб далейшым умацаваньні савецка-эстонскіх добрасусядзкіх адносін, лічачы, што гэтае ўмацаваньне адпавядае і інтарэсам Эстоніі.

У Аўганістане.

Амануллу пакінуў Аўганістан.

ЛЁНДАН, 24-5. Агенцтва Рэйтэр паведамляе з Сімлы: „афіцыйна паведамляецца, што на просьбе Аманулы які перайшоў учора індыйскую мяжу ля Чамана, урад Індыі прадастаўляе Аманулі і яго сьвіце вольны праезд ад мяжы да Бамбея, адкуль Аманула мяркуе накіравацца морам у Эўропу».

Ангельскія агенты ўзрушаюць міжнацыянальную варожасьць у Аўганістане.

КУЛЯБ, 23-5. Уцекачы з Катагану і Бадахшанскай правінцыі перадаюць, што сярод жыхарства нейкія асобы праводзяць узмоцненую агітацыю з мэтаю распаліць міжнацыянальную і міжпляменную варожасьць у паўночным Аўганістане. Агітацыя падтрымліваецца мулламі, а таксама асобамі, вядомымі ў якасьці яўных ангельскіх агентаў. Па ўсім відаць, што праца праводзіцца згодна загадзя распрацаванага ангельцамі пляну, які мае на мэце абярнуць Аўганістан у арэну ўнутранае вайны, каб зьняможыць краіну і паскорыць працэс яе падняволеньня.

Пастановы саюзу гарнякоў Францыі.

ПАРЫЖ. На пасяджэньні пашыранага прэзыдыуму унітарнага саюзу гарнякоў абмяркоўвалася пытаньне аб штодзённых патрабаваньнях францускіх гарнякоў. Прэзыдыум зазначыў, што прыбытак вугляпрамыслоўцаў за апошні год павялічыўся і ня спыняе ўзрастаць. Разам з тым прэзыдыум зазначыў, што ніадзіўне павялічэньне заработку ў паўночным вугольным райёне (у выглядзе прэмій) праведзена толькі з мэтаю раскалоць рабочых і пасварыць адны разрады рабочых з другімі. Прэзыдыум заклікае гарнякоў, каб яны патрабавалі зьменшыць колькасьць разрадаў і павялічыць заработак на 5 франкаў у дзень для ўсіх гарнякоў.

У зьвязку з гэтым на ўсіх прадпрыёмствах павінны быць складзены рудніковыя камітэты, якія згуртоўваюць усіх рабочых як арганізаваных, так і неарганізаваных. Нарэшце, прэзыдыум абмяркоўваў мерапрыёмствы, зьвязаныя з падрыхтоўкаю міжнароднага антываеннага дню, назначанага на 1-га жніўня.

СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ, СУПРОЦЬ НАСТУПУ НА СССР.

Падрыхтоўка да міжнароднага дню барацьбы супроць вайны.

БЭРЛІН, 23-5. Заходня-эўрапейскае бюро Камінтэрну агаласіла паведамленьне, у якім зазначана: „16-га мая ў Брусэлі адбылася скліканая заходня-эўрапейскім бюро Камінтэрну нарада, у якой узялі ўдзел 20 самых буйных камуністычных партый эўрапейскіх капіталістычных краін, а таксама прадстаўнікі КІМ'у і Прафінтэрну. Галоўнаю тэмаю нарады было пытаньне аб падрыхтоўцы да міжнароднага дню барацьбы проці імпэрыялістычнае вайны, назначанага на 1 жніўня 1929 г.

Умоваю для посьпеху ў праведзеньні гэтага дню зьяўляецца поўная перамога над усімі правымі і прымірэнчымі плынямі ўнутры камуністычных партый. Асноваю для праведзеньня кампаніі зьяўляецца рэзалюцыя 6-га Кангрэсу Камінтэрну аб барацьбе проці імпэрыялістычнае вайны; з гэтай рэзалюцыяй павінны быць шырока азнаёмлены ня толькі партыя, але і ўся рабочая клясa.

Галоўнаю мэтаю кампаніі і павінна быць мабілізацыя самых шырокіх мас пралетарыяту і ўсіх працоўных на барацьбу за абарону Савецкага Саюзу. Як пры падрыхтоўцы, так і пры праведзеньні міжнароднага дню барацьбы проці імпэрыялістычнай вайны трэба згуртаваць у адзіны фронт зьнізу самыя шырокія масы рабочых на прадпрыёмствах і ва ўсіх пралетарскіх масавых арганізацыях, а таксама заснаваць органы гэтага адзінага фронту мас.

Формамі праведзеньня гэтага дню павінна быць сыненьне працы і масавыя дэманстрацыі. Неабходна сыстэматычнае асьвятленьне ўсіх пытаньняў, зьвязаных з падрыхтоўкаю вайны проці СССР, у пэрыядычным друку камуністычных партый, а таксама выкарыстаньне парляманцкае трыбуны з мэтаю зганьбіць падрыхтоўку вайны проці СССР.

Нарада заслухала кароткую інфармацыю аб рэвалюцыйным уздыме рабочага руху ў Індыі. Ухвалена паслаць свае міжнародзнае баявое прывітаньне баставючым тэкстыльшчыкам Бамбею. Нарада зварачаецца да ўсіх рабочых і сяброў масавых рэвалюцыйных арганізацый з заклікам узяць удзел у падрыхтоўцы і праведзеньні дню 1 жніўня".

Чаго ехаў у Румынію генэрал Сэкт.

БЭРЛІН. Левая газэта „Бэрлін ам Морген" зьмяшчае паведамленьне з Румыніі аб тым, што лібэральны дэпутат Арджантаяну падаў запытаньне ў сэнат наконт пабыту генэрала Сэкта ў Румыніі. У адказе на гэтае запытаньне прадстаўнік ураду заявіў, што падарожжа Сэкта ў Румынію мела прыватны характар. Карэспандэнт „Бэрлін ам Морген" устанаўляе, што адказ гэты зусім не адпавядаў сапраўднасьці бо між сэктам і Маніё праводзіліся вельмі важныя перамовы аб фінансаваньні нямецкім капіталам румынскае цяжкае і, пераважна, ваяскавае прамысловасьці. Для працягу распачатых генэралам Сэктам тайных перамоў у Румынію 20 мая прыехаў прадстаўнік заводу Крупа ў Эсэне. „Бэрлін ам Морген" з свайго боку бачыць сувязь у падарожжы генэрала Сэкта ў Румынію з вядомымі прыездамі французкага генэрала Лерона ў Румынію і Польшчу. „Усё гэта,—піша газэта,—паказвае вельмі зялёную актыўнасьць імпэрыялістаў і рэальнасьць ваеннае небяспекі, накіраванае ў першую чаргу проці СССР".

Урадавыя ўстановы Нямеччыны былі зьвязаны з бандай фальшыўшчыкаў.

БЭРЛІН, 23-5. Высьвятляецца, што дадатковы абвінаваўчы акт, уручаны ўчора пракурорам Арлову і Паўлаўскаму (Сумарокаву), датычыцца падлогаў, якія абвінавачаныя зрабілі ў адносінах да нямецкага камісарыяту грамадзкага парадку.

У 1926 годзе ў аднаго расейца, арыштаванага па падазрэньні ў шпіянажы ў карысьць СССР, быў знойдзен дакумант які вышаў з агульна-нямецкага міністэрства ўнутраных спраў. Для высьвятленьня абставін, пры якіх загінуў гэты дакумант, пачата было суровае расьсьледаваньне. Пра гэта даведаўся ўдзельнік банды фальсыфікатараў Арлова, Паўлаўскі. Ён прапанаваў нямецкаму камісарыяту грамадзкага парадку свае паслугі ў «выкрыцьці» нязіснуючага шпіянажу з мэтаю атрыманьня назначанай узнагароды. Пасьля гэтага Паўлаўскі перадаў камісарыяту грамадзкага парадку дакументы, нарыхтаваныя фабрыкай фальшывак Арлова.

Абгаварваючы дадатковы абвінаваўчы акт, левая газэта „Бэрлін Ам Морген" заяўляе, што гэта новае абвінавачаньне афіцыйна пацьвярджае, што Арлоў цесна зьвязан з важнымі нямецкімі ўрадавымі ўстановамі. Газэта падкрэсьлівае, што выпадак з Арловым і Паўлаўскім пацьвярджае, як безадказна дзейнічае нямецкі камісарыят грамадзкага парадку пры куплі дакумантаў.

Ультштэйнаўская газэта «Тэмпо» таксама ўстанаўляе, што з дадатковага абвінаваўчага акту, прад'яўленага бандзе фальсыфікатараў Арлова, відаць, што фабрыканты фальшывак зьвязаны з агульна-нямецкім камісарыятам грамадзкага парадку. На працэс Арлова і кампаніі, які адбудзецца ў другой палове чэрвеня, у якасьці сьведак выкліканы, між іншым і кіраўнік камісарыяту грамадзкага парадку обэр-рэгірунгс-рат Мюльэзэн і агент Зівэрт для дачы паказаньняў аб сувязі камісарыяту з фабрыкантамі фальшывак

С.-д. выгараджваюць сваіх прыяцеляў—аўтараў фальшывак.

БЭРЛІН, 23-V. Разгляд справы Росмана, прыцягнутага да крымінальнай адказнасьці ў зьвязку са справаю фабрыкантаў антысавецкіх фальшывак Арлова і кампаніі, распачнецца 11-га чэрвеня ў Бэрліне. Росман абвінавачваецца ў тым, што, знаходзячыся на службе ў інфармацыйным агенцтве Зівэрта, перадаў Арлову для сфатаграфаваньня 6 сакрэтных дакладаў. Апроч таго, Росман абвінавачваецца яшчэ і ў тым, што ён, у якасьці служачага аднаго тэлеграфнага агенцтва, перадаваў паведамленьні канкуруючаму агенцтву. Разгляд справы, узьнятае проці Арлова і Сумарокава, яшчэ не назначан. Газэта «Бэрлін Ам Морген» паведамляе, што расейскі эмігрант Гуманскі, замешаны ў афэру з вырабам антысавецкіх фальшывак—Арловым, знаходзіцца, як і раней, на волі, не зважаючы на загад аб яго высылцы.

Канфіскуюць камуністычныя газэты.

БЭРЛІН, 22-5. Згодна пастановы мюнхенскага акруговага суду былі канфіскаваны нядзельныя нумары баварскіх камуністычных газэт „Нэйе Цэйтунг" «Нордбайрышэ Цэйтунг». У пастанове суду зазначана, што ў канфіскаваных нумарох былі зьмешчаны «заклікі да дзяржаўнае здрады і да клясавае варожасьці".

ПЯТЫ УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ.

Працяг спрэчак па дакладах т. т. Кржыжаноўскага і Куйбышава.

Прамова тав. Луначарскага

МАСКВА, 24-V. На вячэрнім пасяджэньні Усесаюзнага Зьезду Саветаў 24 мая працягваліся спрэчкі па дакладах т. т. Кржыжаноўскага і Куйбышава. Цэнтральным момантам гэтага пасяджэньняў зьяўляецца выступленьне Народнага Камісара Асьветы РСФСР т. Луначарскага ў абарону культурнай часткі пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі. Зьезд спаткаў тав. Луначарскага доўгімі воплескамі.

Для ажыцьцяўленьня пяцігодкі па РСФСР,—гаворыць тав. Луначарскі,—у бюджэце гэтай рэспублікі на дастае 1 мільярду 200 мільёнаў руб. На Усерасейскім Зьезьдзе Саветаў я рабіў спэцыяльны даклад аб дзейнасьці Наркамасьветы РСФСР, у якім я давёў, што культурная частка пяцігадовага пляну распрацавана вельмі скупа. У самы апошні час Дзяржплян СССР зрабіў папраўкі да культурнай пяцігодкі, у якіх дэкляруецца водпуск з агульна-саюзных сродкаў дадаткова 800 мільёнаў руб. на культурнае будаўніцтва РСФСР.

Аднак, неабходна пратэставаць,—кажа далей тав. Луначарскі,—супроць таго факту, што першапачатковыя асыгнаваньні на культурнае будаўніцтва былі ўскладзены цалкам на бюджэт РСФСР. У першыя два гады пяцігадовага пляну ўрад РСФСР, па нашых разьліках, ужо недадасьць 319 мільёнаў руб. на культурнае будаўніцтва.

Тав. Луначарскі падкрэсьлівае, што існуючыя ўмовы для разьвіцьця культурнага будаўніцтва вельмі спрыяючыя. Як довад гэтага, ён прыводзіць сёнешнюю гутарку калегіі Наркамасьветы з групай маладых сялян, якія навучаюцца ў школах сялянскай моладзі. Гутарка гэта зрабіла вельмі моцнае ўражаньне ня толькі на Луначарскага, але і на іншых членаў калегіі. Сялянская моладзь гаварыла аб сваёй школе з вялікім веданьнем справы. Гэта—новая парода людзей, якую нам пачынае давець сучасная вёска.

На вячэрным пасяджэньні выступіў таксама Народны Камісар Працы СССР тав. Угланаў. Ён абмаляваў той вялізарны зрух, які павінен адбыцца ў канцы пяцігодкі ў галіне працы. Вялічэзнаю заваёваю для Савецкага Саюзу зьявіцца ня толькі значнае пашырэньне кадраў індустрыяльных рабочых, ня толькі падвышэньне кваліфікацыі гэтых кадраў, ня толькі паўсяменнае ўвядзеньне ў фабрычна-заводзкіх прадпрыёмствах 7-мі гадзіннага рабочага дню, але і значнае скарачэньне беспрацоўя.

На вячэрнім пасяджэньні выступілі таксама т. т. Радыгіна (Вятка). Агамалы-Огны (Азэрбайджан), Дубаў, (цэнтр), Андропікаў (Урал), Арцюхіна (цэнтр) і іншыя.

МАСКВА. На ранішнім пасяджэньні 25-га мая скончыліся спрэчкі па дакладах Кржыжаноўскага і Куйбышава. Пасьля гэтага з заключным словам выступіў тав. Кржыжаноўскі, які спыніўся падрабязна на некаторых пытаньнях, закранутых у спрэчках.

Калі мы складалі наш плян,—сказаў т. Кржыжаноўскі,—дык нашым лёзунгам было: перадаць яго на суд мас. Тут, у гэтай залі гэты суд адбыўся. Рашаючы актыў нашай краіны ў асобе Усесаюзнага Зьезду Саветаў зрабіў свой прысуд над пяцігадовым плянам. Я кінуў тут лёзунг: „Даём пяцігодку". Вы адказалі мне: «Даём пяцігодку». Зараз я спакойны за ёе пяцігодкі, бо яна ў вашых руках.

Абавязковаю ўмоваю для ажыцьцяўленьня пяцігодкі зьяўляецца адзінства нашага штабу, ленінскай камуністычнай партыі,—заўляе т. Кржыжаноўскі пад бурныя воплескі залі.

Другою ўмоваю зьяўляецца тое, каб кожны рабочы і селянін мабілізаваў усю сваю ўвагу на выкананьне вялікіх задач, пастаўленых пяцігодкаю. Кожны актывіст павінен задаць сабе запытаньне: а што ён можа і павінен зрабіць, каб ажыцьцявіць гэты вялікі плян?—Усё наша жыцьцё, усе нашы сілы, усе нашы магчымасьці—на справу будаўніцтва сацыялізму.

Для складаньня рэзалюцыі па дакладах т. т. Кржыжаноўскага і Куйбышава Зьезд абірае камісію.

На вячэрнім пасяджэньні з дакладам аб сельскай гаспадарцы выступіў т. Калінін.

Аганькі вялікай будучыны.

(Ліст з Масквы).

„5-й С'езд Советов Союза ССР".

Гэтыя словы далёка віднеюцца і кідаюцца ў вочы кожнаму, хто праходзіць каля „Большого" тэатра ў Маскве, сьцены якога ад нізу да верху пакрыты доўгімі шырокімі чырвонымі стужкамі.

У гэтыя дні „Большой" тэатр многалюдны, да адказу запоўнены дэлегатамі з усіх канцоў нашага вялікага Савецкага Саюзу.

Тут засядае гаспадар Савецкай Зямлі—5-ы Зьезд Саветаў СССР.

* * *

А 10-й гадзіне раніцы пачынаюць сходзіцца дэлегаты. Партэр і ўсе ярусы хутка напаўняюцца прадстаўнікамі розных нацыянальнасьцяў, лепшымі сынамі рабочых і сялян. Перад вачыма скураныя куртці, фрэнчы, сялянскія армякі, чырвоныя хусткі, каўкаскія буркі...

І ня дзіва, бо тут засядае Зьезд Вялікай Краіны, на які кожны дэлегат прыехаў у сваім нацыянальным убраньні.

Званок. Заціхаюць тысячы галасоў. Члены прэзыдыуму зьезду займаюць свае месцы; сярод іх т. т.—Калінін, Чарвякоў, Пятроўскі, Файзула Хаджаеў, Куйбышаў, Чубар.

Сёньня (23 мая) на зьезьдзе разглядаецца пяцігадовы плян разьвіцьця гаспадаркі і культуры СССР.

Слова даецца старшыні дзяржпляну СССР т. Кржыжаноўскаму, якога зьезд сустракае доўгімі, гучнымі воплескамі. Наступны дакладчык па пяцігадоваму пляну—т. Куйбышаў.

Уверсе, над прэзыдыумам зьезду, вісіць вялікая карта, на якой электрычнымі аганькамі дакладчык дэманструе перад зьездам пяцігадовы плян. Трэба адзначыць, што гэта электрычная карта дае наглядны малюнак пяцігодкі ўсім прысутным дэлегатам. Калі, напрыклад, дакладчыку трэба паказаць базу апалу СССР, дык на карце адразу загараюцца аганькі ў райёнах Дамбасу, Кузьнецкага басэйну, Алтаю.

Дакладчыкі спыняюцца на ўсіх галінах і праблемах пяцігадовага пляну, і за кожным разам загараюцца на карце ўсё новыя і новыя аганькі.

Тав. Кржыжаноўскі заканчывае свой даклад і паказвае пальцам на карту, якая ўсеяна **сотнямі аганькоў.**

Гэта аганькі не дзеля прыгожасьці,—**гэта аганькі вялікай будучыны працоўных Савецкага Саюзу.**

Апошнія словы т. Кржыжаноўскага пакрываюцца гучнымі, доўга нясьцихаючымі воплескамі. Усе ўстаюць і сьпяваюць «Інтэрнацыянал».

Настрой у дэлегатаў узьняты, бадзёры. Ён сьведчыць аб тым, што працоўныя Савецкага Саюзу ўпэўнена ідуць па шляху сацыялістычнага будаўніцтва, пад лёзунгам—індустрыялізацыі прамысловасьці і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

* * *

Так ужо чацьверты дзень Зьезд Саветаў разглядае пытаньні вялікай важнасьці. Ад 10-й гадзіны раніцы да 9-й гадзіны вечара ідзе дзелавая праца Зьезду.

Я. ЗБУРЖЫНСКІ.

Водгукі 5-га зьезду за межамі.

МАСКВА. У аўстрыйскім, вэнгерскім балканскім, нямецкім, чэха-славацкім друку агалошаны падрабязныя вытрымкі з дакладу т. Рыкава на зьезьдзе саветаў. Лёнданскія газэты зьмясьцілі толькі кароткія вытрымкі дакладу. Ад камэнтарыяў газэтыя акуль стрымліваюцца. Артыкул «Руде Право» з камэнтарыямі адносна дакладу Рыкава забаронен цэнзурай.

„Рэвалюцыйныя" задачы Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу.

ПРАГА, 23-5. Пачалася сэсія Выканкому Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу прафсаюзаў. На першым пасяджэньні быў заслухан даклад сакрататара Выканкому Канцэнбаха. У спрэчках галяндзкі прадстаўнік адзначыў актыўнасьць чырвоных прафсаюзаў на Далёкім Усходзе, а таксама ў Паўднёвай Амэрыцы і Аўстраліі. **Купэрс прапанаваў арганізаваць паездку амстэрдамцаў у гэтыя краіны дзеля ўзмацненьня барацьбы супроць рэвалюцыйнага прафруху.**

У КІТАІ.

Дзейнасьць камуністычных атрадаў у Гуандуні

ШАНХАЙ, 24-V. Агенцтва Тохо паведамляе з Ганконгу, што кантонскія камуністы, колькасьць якіх, як лічыць агенцтва, дасягае 3.000 чалавек, падрыхтоўваюць у Кантоне паўстаньне пры дапамозе рабочых. У райёне паўночнае і ўсходняе рэчак апэруюць значныя камуністычныя атрады.

Японія ратуе сваё становішча ў Кітаі.

ТОКІЁ. 23-V. Увесь японскі друк паведамляе, што ўчора адбылася нарада прадстаўнікоў усіх міністэрстваў. На гэтай нарадзе былі намечаны галоўныя моманты мяркуемай япона-кітайскае згоды. Згодна гэтага праэкту, Японія прызнае аўтаномнасьць Кітаю пры ўмове скасаваньня некаторых галін ападатківаньня і ўтварэньня згоды ня аснове ўзаемнасьці. Далей Японія згаджаецца зьнішчыць экстэрытарыяльнасьць, але ў парадку паступовасьці. Японія прызнае прынцып узаемнасьці ў пытаньні аб навігацыі ў водах кожнае з дзяржаў, але з тым, каб ня былі зьменшаны ці страчаны правы і інтарэсы Японіі, замацаваныя за ёю ў сучасны момант. Нарэшце, Японія прызнае прынцып звароту тэрыторыі Кантэсіі, але зноў у парадку паступовасьці.

Японскі пасланьнік у Кітаі Іёнызава выязджае заўтра ў Кітай.

Згода кітайскае і японскае ўлады.

ШАНХАЙ, 24-V. Кітайская і японская ўлада ў Ханькоў ўтварыла згоду. Кітайцы спыняюць байкот і канфіскацыю японскіх тавараў. Японцы вывозяць сваіх маракоў, якія знаходзіліся ў Ханькоу з красавіка 1927 году, і выплачваюць 6 тысяч даляраў сям'і кулі, забітага летась японскімі маракамі.

Змова Фынь-Юй-Сяна.

ШАНХАЙ, 22-5. „Норт Чайна Дэйлі Ньюс» паведамляе на падставе японскіх вестак, што на кватэры Фынь-Юй-Сяна выкрыты дакументы, якія даводзяць існаваньне змовы на чале з Фынь-Юй-Сянам і Ван-Цьзін-Вэем. Апошні ў пачатку сакавіка сёлета набываў у Нямеччыне і Францыі вайсковыя прылады. У выпадку посьпеху змовы да Фынь-Юй-Сяна павінны былі перайсьці ўсе вайсковыя справы, а да Ван-Цьзін-Вэя—цывільнае кіраўніцтва.

Чан-Кай-Шы дамагаецца дапамогі Мукдэну.

ХАРБІН, 24-V. Як паведамляюць з Мукдэну, Чан-Кай-Шы дамагаецца, каб Чжан-Сюэ-Лян узяў актыўны ўдзел у кампаніі проці Фынь-Юй-Сяна. Між іншым, Чан-Кай-Шы прапануе пасунуць мукдэнскае войска на поўдзень ад Шанхай-Гуаню. За гэта мукдэнцы абяцаецца пасада гарадзкога галавы ў Цянцьзіне. Мукдэнскі арсэнал працуе пры поўнай нагрузцы.

Чжан-Сюэ-Лян падрыхтоўваецца.

ХАРБІН, 22-5. Чжан-Сюэ-Лян тэрмінова склікаў нараду ўсіх манчурскіх лідэраў. Нарада разгледзіць пытаньні, зьвязаныя з выступленьнем Фынь-Юй-Сяна. У абежнай тэлеграме Чжан-Сюэ-Ляна наконт апошніх падзей зазначана: „У гэты трывожны момант патрэбна асьцярожнасьць у перамовах і зносінах з асобнымі групоўкамі. Трэба быць напагатове для абароны 3-х усходніх правінцый".

За што іх расстралялі.

МАСКВА. Пад такім загалоўкам газэта „Гудок" паведамляе падрабязнасьці змовы транспартных шкоднікаў. Іх было больш 20 чалавек. Усё гэта былыя акцыянэры Маскоўска-Казанскай, Паўдзённа-Ўсходняй, Разана-Уральскай і Віндава-Рыбінскай чыгункі.

Мэкк і Вялічка сталі на чале гэтай кампаніі шкоднікаў. „Гудок" піша: „яны спрабавалі стварыць цяжкі транспартны крызіс. Яны спрабавалі стварыць гэты крызіс шляхам развалу ў першую чаргу цягніковага парку. Для гэтага па пляну запускалі парк, псавалі цягніковыя катлы і мэханізм, а таксама проста зьнішчалі годныя паравозы або здавалі іх, як лом, Рудмэталгандлю. Гэтыя агідныя шкоднікі разьбілі шмат цягнікоў хадавых сэрый (О. Д.—вялікае і інш.). Яны здавалі ў лом годныя запасныя часткі цягнікоў. Яны ўжылі ўсе свае „таленты» на тое, каб шкодніцкай дэзарганізацыяй парушыць сыстэму запасных частак на заводах ВСНГ. Руйнаваньне паравознага парку яны прыкрывалі фальшывымі статыстычнымі данымі. Яны аблытаглі складаным павуціньнем дэзарганізацыі ўсе рацыяналізатарскія мерапрыёмствы. Яны не абсталявалі цягнікоў ваданагравацелямі і пераперагравацелямі.

Паны Мэккі мелі непасрэдную сувязь з шахцінскімі „гэроямі» і прымалі ад іх нягодны апал. Нягодны апал выдаваўся на цягнікі. Гэта выклікала перагараньне катлоў, прыпынкі з-за нагону пару. Гэта выклікала неадаволеньне брыгад. Але гэтым не абмяжоўвалася шкодніцкая дзейнасьць панаў акцыянэраў. Яны злосна запусьцілі сыстэму забясьпечаньня вадой, складалі няправільныя графікі таварных і пасажырскіх паездоў. Яны спрабавалі, нарэшце, затрымліваць паравозку грузаў. Але і гэтага мала.

Паны Мэккі распрацавалі падрабязны плян дэзарганізацыі ўсіх галін транспартнай гаспадаркі. Іх тайным жаданьнем было зрабіць немагчымым паравозку вайсковых грузаў. Няма магчымасьці пералічыць усе справы, пляны і мары шкоднікаў. Досыць сказаць, што гэты плян ня быў праведзен у жыцьцё толькі дзякуючы таму, што АДПУ СССР своечасова пасадзіла бандытаў за краты, пачаўшы першыя арышты ў лютым 1928 г.

Для таго, каб уявіць сабе, як далёка заходзілі пляны панаў-акцыянэраў, досыць бегла азнаёміцца з адным з гэтых плянаў. Тут мы маем справу з нагным праэктам увядзеньня „звыштэрміновых цягнікоў сэрыі „А" Гэту сэрыю яны самі надумалі, сэрыю так сказаць, цягнікоў-шкоднікаў. Увядзеньне гэтых цягнікоў патрабавала б зьмены ўсіх мастоў Савецкага Саюзу, зьмены ўсіх рэек, верхняй будовы шляху, зьмены ўсіх насыпаў, як і перабудовы ўсіх станцый Савецкага Саюзу. Гэта-б каштавала шмат мільярдаў руб. Яны разьлічвалі распыліць тыя мільярды, якія пралетарыят нашай краіны з такімі цяжкасьцямі здабывае ўпартай працай. Але жарты былі своечасова спынены пільнасьцю АДПУ.

Трэба сказаць, што ў выкрыцьці шкодніцкай шайкі прымалі непасрэдны ўдзел тысячы рабочых, членаў нашага саюзу, саюзныя органы і цэнтральны камітэт саюзу. Звыш тысячы цяплоўскіх машыністаў далі свае паказаньні па гэтай справе. У гонар асноўнай масы нашых спэцыялістаў трэба сказаць, што ў выкрыцьці банды Мэкка прымала блізкі ўдзел значная колькасьць інжынэраў і тэхнікаў. З гэтымі спэцыялістамі рабочая кляса нашай краіны зьвязана вялікаю прыязьнью і супольнай працай.

Няправільныя нормы апошаньня пальцавядучых крывашыпаў, як і пераўмяншэньне, з мэтаю шкодніцтва памярцяляў былі выкрыты пры садзейнічаньні шэрагу інжынэраў, нашых таварышоў па барацьбе і працы. Гэтых таварышоў рабочая кляса вдолее адмежаваць ад спэцедзтва.

Шкоднікі ў спробе зруйнаваць наш вагонны парк дайшлі да таго, што выдумалі вагоны з асобнай канструкцыяй, якда ў якіх будзе напамінаць перажываньні марской качкі. Зараз гэта белакостная сволач у руках пралетарскай улады. Адны пакараны найвышэйшаю мераю, другія здасланы ў канцэнтрацыйныя лягеры і за пагрузкай

РЭПАРАЦЫЙНАЕ ПЫТАНЬНЕ.

Рэпарацыйныя перамовы ня выходзяць з тупіку.

БЭРЛІН, 23-V. Увесь буржуазны друк аднадушна заяўляе аб узьнікненьні сур'ёзных цяжкасьцяў на парыскай рэпарацыйнай канфэрэнцыі. Цяжкасьці выкліканы, з аднаго боку, зьместам меморандуму, які зьяўляецца адказам на нямецкія агаворкі да пляну Юнга. Водгук думкі друку, адказ саюзьнікаў у значнай ступені зьмяняе плян Юнга не на карысьць Нямеччыны. Паводле думкі нямецкіх колаў, важнейшаю перашкодаю на шляху да згоды зьяўляецца адмова, якая датычыцца патрабуемага Нямеччынай мораторыя.

Нацыянальны друк патрабуе катэгарычнага адхіленьня мэмарандуму саюзьнікаў. Ускладненьні рэпарацыйных перамоў, з другога боку, выкліканы сур'ёзнымі разгалосьсямі ўнутры нямецкай дэлегацыі. Другі галоўны нямецкі экспэрт Фэрглер, як толькі зьявіліся першыя весткі аб тым, што саюзьнікі адхіляюць найбольш важную частку нямецкіх агаворак, заявіў аб адстаўцы. Наступнік Фэрглера—Кастль—член прэзыдыуму і кіраўнік справамі агульна-нямецкага саюзу прамысловцаў.

Чаму нямецкі экспэрт па рэпарацыях падаўся ў адстаўку

ПАРЫЖ, 24-V. Як паведамляюць французкія газэты, нямецкі экспэрт Фэрглер падаўся ў адстаўку з прычыны таго, што ён дамагаўся неабходнасьці вызначыць сярэдні разьмер штогодных узносаў Нямеччыны ў 1.650 міліёнаў марак, як патрабаваў спачатку Шахт. Апроч таго, Фэрглер ня лічыць магчымым плаціць далей, як 37 гадоў, г. зн. згашаць саюзьніцкую запазычанасьць Амэрыцы за кошт Нямеччыны. Гэтая падстава адстаўкі Фэрглера сьведчыць, наколькі сур'ёзным зьяўляецца сучасны крызіс у працы канфэрэнцыі. Французкі друк спрабуе стварыць уражаньне, што гэтыя патрабаваньні высоўваліся толькі Фэрглерам, як прадстаўніком нямецкае цяжкае прамысловасьці. Аднак, на справе гэтыя патрабаваньні адпавядаюць напрамку нямецкае дэлегацыі. Друк загадзя ўскладае ўсю адказнасьць за магчымы разрыў на нямецкіх экспэртаў і падкрэсьлівае іх вялікую залежнасьць ад нямецкае цяжкае прамысловасьці.

Амэрыка імкнецца зблізіцца з Нямеччынаю.

ВАШЫНГТОН, 20-V. Афіцыйна паведамляецца, што прэзыдэнт Гувэр прапанаваў пайсьці на некаторыя ўступкі па пытаньні аб скарачэньні выдаткаў Нямеччыны на ўтрыманьне амэрыканскай акупацыйнай арміі. Канкрэтны зьмест прапановы Гувэра не агалошан; вядома толькі, што справа ідзе аб расклады тэрмінаў выплат, належачых з Нямеччыны. Прапанова Гувэра мае ўмоўны характар, паколькі яна павінна быць зацьверджана кангрэсам.

Англія перад выбарамі.

Заява лібэральнай партыі аб замежнай палітыцы.

ЛЁНДАН, 23-5. Агенцтва Рэйтар паведамляе: „апублікавана афіцыйная заява аб замежнай палітыцы лібэральнае партыі, якая падпісана Лёйд Джорджам і іншымі лібэральнымі лідэрамі. У гэтай заяве ўказваецца, што першай мэтай замежнай палітыкі лібэралаў зьяўляецца—дабіцца адхіленьня вайны ў якасьці мэтаду разьвязваньня паміжвародных канфліктаў. У якасьці іншых пунктаў замежна-палітычнай праграмы лібэралаў высунуты: «па магчымасьці больш скорае агульнае скарачэньне ўзбраеньняў, пагоджаньне з Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі адносна парытэту марскіх узброеньняў, аднаўленьне нармальных адносін з СССР, як толькі гэта будзе магчыма, на падставе ўзаемнага няўмешваньня ва ўнутраныя справы».

БУРНЫЯ СЦЭНЫ Ў ФРАНЦУСКІМ ПАРЛЯМАНЦЕ

Адчынілася сэсія французскага парляманту.

ПАРЫЖ, 23-V. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Адчынілася сэсія парляманту. Камуністы патрабавалі абмеркаваць у першую чаргу заходы, ужытыя ўрадам 1-га мая. Міністр унутраных спраў Тард'е у зьвязку з запытаньнем наконт 1-га мая паставіў пытаньне аб даверы, зьвязаўшы яго з пытаньнем аб адкладзе запытаньняў. Палата дэпутатаў большасьцю 326-ці галасоў проці 258 выказалася за адклад.

„Сацыялісты" Францыі ня ўступаюць у подласьці сацыял-дэмакратам Нямеччыны.

ПАРЫЖ, 24-5. Учарайшае першае пасяджэньне французкай палаты пасьля аднаўленьня работ адзначалася бурнымі сцэнамі, узьнікшымі пры абмеркаваньні патрабаваньняў камфракцыі зараз-жа адкрыць дыскусію па інтэрпэляцыі Кашэна аб мерапрыёмствах ураду ў сувязі з першамайскім сьвятам. Патрабаваньне неадкладнага абгаварэньня інтэрпэляцыі Кашэна падтрымлівалася сацыялістамі і радыкаламі, якія зазначалі на незаконнасьць арышту напярэдадні 1 мая 3 з паловаю тысяч ні ў чым непавінных грамадзян.

Аднак, выступленьне сацыялістаў было завострана ня супроць ураду, а супроць камуністаў. Сацыялісты кожную хвіліну перапынялі Кашэна выгукамі аб „чырвоным тэроры", называлі першамайскія падзеі «інсцэніроўкай» і дагаварыліся да таго, нібы кампартыя загадзя змовілася з Тард'е (міністр унутраных спраў) аб масавых арыштах, каб гэтым ухіліцца сутычкі з паліцыяй.

Гэта заява сацыялістаў спаткана сьмехам нават на правых лаўках. Кашэн назваў гэты паклёп подлым глупствам і спытаў у сацыялістаў, ці ня змовілася кампартыя з міністрам унутраных спраў таксама аб нясупынных вобысках, аблавах і арыштах камуністаў, аб зьніклоньні звыш 100 камуністычных працаўнікоў у турмах, аб міліённых штрафах за артыкулы ў камуністычных газэтах, аб анулываньні выбараў камдэпутатаў і г. д.

Адказваючы ад імя ўраду, Тард'е апраўдвае арышты неабходнасьцю папярэдзіць «выкананьне пляну паўстаньня». Зьвяртаючыся да сацыялістаў, Тард'е заявіў, што ён гатоў зьліквідавацца над імі, і напомніў аб ролі сацыял-дэмакратаў у берлінскіх падзеях. Тэрміновасьць інтэрпэляцыі Кашэна адхілена большасьцю 326 галасоў супроць 258.

У Саюзе ССР.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб працы ў галіне зьнішчэньня няпісьменнасьці.

МАСКВА. 23-V. ЦК УсеКП(б) ухваліў пастанову аб працы ў галіне зьнішчэньня няпісьменнасьці. ЦК прапануе рашуча ўзмацніць тэмп зьнішчэньня няпісьменнасьці, ахапіўшы ў першую чаргу ў горадзе індустрыяльных рабочых і новыя пласты пралетарыяту, а на вёсцы—парабкоў, рабочых савгасаў, сэзоньнікаў, беднату і сяброў калгасаў. Неабходна зьнішчыць няпісьменнасьць індустрыяльных рабочых у гадавы, а рабочых савгасаў і сяброў калгасаў—у 2-хгадавы тэрмін.

Пастанова зазначае, што таварыства „Прэч няпісьменнасьць» праводзіла сваю працу замкнута, апаратнымі мэтадамі і ня здолела арганізаваць навакол зьнішчэньня няпісьменнасьці шырокае грамадзкасьці. Таварыства „Прэч няпісьменнасьць" павінна рашуча перабудаваць мэтады сваёй працы. Пастанова кажа таксама, што ў некаторых усходніх рэспубліках і абласьцёх, а таксама сярод нацыянальных меншасьцяй, задача зьнішчэньня няпісьменнасьці зьяўляецца галоўнай і самай значнай задачай усяе культурнае працы.

ЦК прапануе прадугледзець у дзяржаўным бюджэце на 1929—30 год значнае павялічэньне асыгнаваньняў на датацыі адсталым райёнам (Цэнтральна-Чорназёмная вобласьць, Сярэдня-Волская вобласьць) і ўсходнім нацыянальным рэспублікам і абласьцём.

35-ГОДЗЬДЗЕ МАСКОЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ УсеКП(б).

МАСКВА. У калённай залі Дому Саюзаў адбылося ўрачыстае пасяджэньне з поваду 35-годзьдзя маскоўскай арганізацыі УсеКП(б). Сэкратар маскоўскага камітэту т. Бауман адзначыў, што маскоўская арганізацыя заўсёды трымала высока сьцяг бальшавізму. Ад імя ЦК УсеКП маскоўскую арганізацыю вітаў т. Яраслаўскі, які адзначыў, што яна заўсёды заставалася вернай ленінізму і з барацьбы з хістаньнямі выходзіла заўсёды яшчэ больш згуртаванай.

Сход наладзіў авацыю прысутнічаўшым старэйшым бальшавікам—заснавальнікам маскоўскай арганізацыі—Міцкевічу, Уладзімірскаму, Вінакураву і інш. Маскоўскую арганізацыю віталі таксама прадстаўнікі Ленінградзкай, Тульскай і Цьвярской арганізацый УсеКП(б), а таксама рабочыя прадстаўнікі маскоўскіх фабрык, заводаў, Донбасу і інш.

Падрыхтоўка да перавозкі уральскае нафты.

Прэзыдыуму ЦК саюзу воднікаў пасьля дакладу намесьніка старшыні Уральскага выканкому т. Андронікава прапануе НК Шляхоў неадкладна распачаць падрыхтоўку флёту для рэгулярных перавозак уральскае нафты. У першую чаргу НК Шляхоў разам з прадстаўнікамі краявых урадавых і грамадзкіх арганізацый Уралу павінен намеціць мерапрыёмствы для паглыбленьня рэчак Белай і Чусавой. Апроч таго, на думку ЦК саюзу воднікаў, трэба распачаць пабудову спэцыяльнае нафтавае прыстані.

Новыя дасьледчыя партыі едуць на Урал.

ЛЕНІНГРАД, 24-V. Геалёгічны камітэт паслаў на Чусоўскія нафтавыя месцароды дзьве дадатковыя партыі—тапаграфічную і геалёгічную. Сьпешна арганізоўваюцца два геалёга-дасьледчыя атрады для закладкі 4-х новых буравых скважын.

Рост ліку вынаходак.

ЛЕНІНГРАД, 24-V. Апошнія мерапрыёмствы ўраду па ўрэгуляваньні вынаходніцкай справы выявілі моцны прыток заяваў вынаходцаў. За 7 месяцаў сёлетняга гаспадарчага году ў камітэт па справах вынаходак паступіла 13000 заяваў—столькі, як за ўвесь мінулы год.

5000 з ліку гэтых заявак зроблены рабочымі і інжынэрамі. Некаторыя заводы далі заданьне адабраць з гэтых заяваў наеабходныя ім вынаходкі.

Нябывалы лівень у Днепрапятроўску.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 24-V. Учора над горадам пранеслася навальніца з градам і ліўнем нябывалай сілы. Вялікія патокі вады рынуліся на вуліцах гораду, змываючы ўсё па дарозе. Вышыня вады на праспэкце ў цэнтры гораду дасягала аднаго мэтра. Вада зносіла пешаходаў, кіёскі, платы, размыла тратуары, заліла сутарэньні. Лівень цягнуўся 3 з паловаю гадзіны. У нізкіх месцах гораду зьнесены старыя будынкі і заліты аднапаверхавыя дамы. Ёсьць чалавечыя ахвяры; пакуль знойдзена 12 трупаў. Страты дасягаюць буйных разьмераў. Пажарныя часьці бязупынна працуюць над выкачваньнем вады. Лівень нанёс буйныя страты мясцовым заводам. Нармальная праца мэталюргічнага заводу імя Пятроўскага была парушана. У шэрагу цэхаў праца зусім спынілася.

ХАТЫ-ЧЫТАЛЬНІ І БАРАЦЬБА СА ШКОДНІКАМІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ.

З 26 мая па 10 чэрвеня будзе праводзіцца двухтыднёвік барацьбы са шкоднікамі сельскае і лясное гаспадаркі.

Кожнаму з нас добра вядома, што шкоднікі для гаспадаркі прыносяць надзвычайна вялікія страты. Каб зьберагаць штогод мільёны пудоў жыта, пшаніцы і іншых збожжавых культур, якія зьнішчаюцца шкоднікамі—трэба барацьбу з гэтымі шкоднікамі зрабіць ударнаю і сталаю.

У вёсцы трэба стала ўзяцца за гэтую працу нашым хатам-чытальням і чырвоным кутком. Трэба ўсю гэтую працу цесна ўвязваць са ўсёй аграпрапагандай і задачамі падвышэньня ўраджайнасьці, праводзячы штодзённа і стала. Каб лягчэй было праводзіць усю гэтую працу, хатніку неабходна выкарыстоўваць увесь актыў, сельска-гаспадарчыя гурткі, гурткі асоавіахіму і прыродазнаўчыя, прыцягнуўшы да ўдзелу і дапамогі вясковы камсамол, настаўніка і агранома.

Усю масавую працу ў гэтым напрамку хатам-чытальням прыдзецца праводзіць шляхам галосных чытак, масавых гутарак і лекцый на тэмы аб шкодніках сельскае гаспадаркі і мерах барацьбы з імі, выкарыстоўваючы для падмацаваньня пададзеных фактаў мясцовыя матар'ялы. У галіну масавае працы трэба ўключыць і правядзеньне экскурсій з сялянамі ў калгасы, савгасы, дасьледчыя палі і г. д., дзе-б селяніну можна было азнаёміцца з гатункавымі расьлінкамі, з мерамі барацьбы са шкодникамі і г. д. Побач з гэтым надзвычайна будзе важна—шырока папулярызаваць і прасунуць у бядняцка-сераднякцкія гушчы насельніцтва сельска-гаспадарчую літаратуру, асабліва па пытаньнях барацьбы са шкодникамі.

Вялікую працу ў справе барацьбы са шкодникамі сельскае гаспадаркі і дапамогі хаце-чытальні павінны праводзіць гурткі—сельска-гаспадарчыя, прыродазнаўчыя і асоавіахіму, сваім прыкладам па выкананьні тых ці іншых мерапрыёмстваў у барацьбе са шкодникамі, яны павінны заахвочваць усю вёску. Пры кожнай хаце-чытальні раім арганізаваць куток „шкоднікі нашых палёў і як з імі змагацца", тут трэба сабраць калекцыі шкоднікаў палёў, гародаў, садоў данае мясцовасьці, з паказаньнем, якую шкоду яны прыносяць і як з імі змагацца, тут-жа трэба ў лічбах паказаць колькі псуюць збожжа шкоднікі, для гэтага таксама прыдзецца выкарыстаць мясцовыя факты.

Важна, каб да справы барацьбы са шкодникамі прыцягнуць усю масу бядняцка-сераднякцкага насельніцтва і шляхам правядзеньня вышэй адзначаных мерапрыёмстваў і дапамогі мясцовых аграномаў навучыць селяніна ўсім найбольш даступным спосабам барацьбы са шкодникамі **і дабіцца іх пагалоўнага зьнішчэньня.**

Пры правядзеньні ўсяе кампаніі хатнікам патрэбна мець на ўвазе папулярызацыю хімізацыі сельскае гаспадаркі, неабходна растлумачыць працоўнаму насельніцтву значэньне хіміі ў справе палепшаньня сельскае гаспадаркі, у справе барацьбы са шкодникамі, дамагаючыся ў кожнай вёсцы арганізацыі гуртка і ячэйкі Асоавіахіму.

Лік. Сеўрук.

Фэльетон.

Пад цягнік, альбо зноў у Аршыцу?

Рака сьмерці працякае праз Воршу. Не седавалосы Дняпро,—ён чысты, крышталёвы, бяз плямаў. Ёсьць другая рака,—брудная, гразкая,—рака абываталяў і мяшчан. Завецца яна Аршыцай. Мутнымі вечарамі падыходзіць да яе „Фэрапонт Сапрановіч, кашляе майскім кашлем, ускідвае на лоб непатрэбныя акуляры і ціхім, магільным голасам апавядае:

— Страшэнная рака. Паданьні расказваюць, што ў ёй жыве вадзянік. Кожны год яму патрэбна чалавечая кроў. Тысяча агентаў «цара Аршыцы» шукаюць на зямлі патрэбную ахвяру. Бывае, што і двух чалавек штурхаюць у рэчку, от і сёлета...

Наляцеўшы вецер зрывае капялюш Фэрапонта Сапрановіча, былога ўласьніка фабрыкі папярос з маркаю «Орша—город, высший сорт». Вецер ня хоча слухаць бяззубага шамканьня аб міфічных лягэндах і паданьнях, гнілой Аршыцы і вадзяніку. Сьвежы вецер рабочай і грамадзкай зацікаўленасьці патрабуе аб'ектыўнага аналізу трагічнага выпадку на Аршыцы.

— Хто вінават, што двое былых бяспрытульных—Маскаленка Тодар і Галынец Янка кінуліся тапіцца ў Аршыцу?

Усе ведаюць, што Маскаленка і Галынец пасьпяхова скончылі сьлясарную майстэрню Мсьціслаўскай дзіцячай камуны, што яны ў Воршы вытрымалі выпрабаваньне на сьлесароў 6 разраду, што біржа працы пасылала на работу несяброў саюзу, пакідаючы беспрацоўнымі цэлы год двух бяспрытульных.

Яны яшчэ маладыя, толькі ўзыходзячыя на ганкі жыцьця, жадалі работы, работы і работы. Прыходзілі на закінутую ў задняпроўскую глушь біржу працы. Плакалі, ламалі рукі. Яны былі згодны цалаваць чаравікі загадчыка біржы, у якога замест сэрца—цагліны кавалак і замест чалавечых нэрваў—іржаўлены дрот. Ім заўсёды,—як прыкра і больна!—ім заўсёды прыглушаным шыпеньнем адказвалі звычайным, штодзённым, падобным адно да другога:

— Вон, чорнамазыя! Вон!

І яны ішлі. ішлі сьветлымі аршанскімі вуліцамі, залітымі электрычнасьцю і пражорлівым гулам сьвятошнага натоўпу. Ішлі да прыватных саматужнікаў за 14-гадзінным днём, трыма грыўнамі зарплаты і мордабоем п'янага майстра.

А ў пачатку мая саматужнікі ім сказалі, што ў іх няма сыравіны, што ім самім нечага рабіць, што яны ім больш непатрэбны. Маскаленка і Галынец апынуліся на вымытых вясеньнім дажджом тратуарах. Без работы. Без капейкі грошай. Без пэрспектывы на будучыню.

— Што рабіць? Куды пайсьці? Як жыць? Паехаць у вечныя экскурсіі—Ворша—Масква—Уладывасток? Запамятаваць сьлясарства і ўспомніць нясхітрую, але рызыкоўную тэхніку і тактыку наступу на сытую, адкормленую масу людзей? Альбо аддацца ў абыймы вадзяніка Аршыцы, апынуцца ў зялёным раю ці ў чорным пекле (якая розьніца), дзе ня трэба клапаціцца аб кавалку чорствага хлеба і шклянцы прэснай вады?

Яны парашылі зрабіць апошняе. „У адзін з прыгожа-вясеньніх дзён", калі Аршыца дыша пахам адкідаў і трушчоб гораду, бяспрытульныя ўлезлі на раськвечаную вольху і ў момант, напярэдадні сказаўшы таварышу апошняе „бывай", кінуліся ў рэчку. Забулькацела вада, трывожна зашалясьцелі вербы, ліпы, вольхі.

Толькі выпадковасьць выратавала Маскаленку і Галынца. Каб не Салтановіч і іншыя міжвольныя сьведкі—самагубцы расхаджвалі-б у пекле. І няпрытомных выцягнулі на бераг Больніца. Мацярынскі догляд. Яны здаровы. Яны зноў на вуліцы.

Ізноў у такім-жа парадку ідуць чорныя, расфарбаваныя сажаю голадні. Загадчык біржы бяз нэрваў і цаглінаю замест сэрца. Нявырашаныя пытаньні—для чаго вучыліся, для чаго нас бралі з вуліцы? Ці варта было для такога жыцьця губляць буйны „курортныя" рысы характараў і атручвацца сьвядомасьцю для сьвядомасьці?

І, адчуваючы фальшывасьць гэтага сьветапогляду, васемнаццацігадовы юнакі заходзяць у цёмны кут чатырохкутніка гарадзкога саду, глядзяць галоднымі вачыма на стракаты, вясёлы натоўп і, змораныя дзённой сумяшнёй, кладуцца на росную зямлю.

Яны бачаць дзіўныя і салодкія малюнкі. Вецер вялі-і-кі,—ня вецер, а завіруха гуляе над Воршай,—налятае на біржу працы, падхоплівае загадчыка за полы паліто, і гоніць-гоніць да самай Аршыцы, а там прарысты вадзянік, з сінімі травяністымі вачыма, цягне яго ў вадзяныя нетры.

Але гэта толькі сон, які чакае ператварэньня ў сапраўднасьць.

Цім. Зарэчны.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Сяўба на Аршаншчыне.

Ворша, 23-5. Яшчэ на пляну весьнавой пасеўнай кампаніі меркавалася пашырыць пасеўную плошчу ў савгасах на 13 проц. Гэта павінна было быць зроблена за лік цаліны і за лік папару, які быў да гэтага году незанятым. Папар мысьлілі засеяць пераважна вікай, але аказалася, што насеньня вікі не завезьлі і яго трудна дзе небудзь купіць. Некаторыя савгасы закупілі насеньне вікі на прыватным рынку, а некаторыя не, і пагэтаму выканаць плян аб пашырэньні пасеўнай плошчы поўнасьцю будзе вельмі цяжка і некаторыя савгасы яго ня выканаюць.

Пасеўная плошча па калгасах будзе павялічана на 9,1 проц. супроць мінулага году.

Сяўба ўжо пачалася, але ў некаторых савгасах распачаць сяўбу немагчыма, бо разьліў Дняпра заліў усё поле.

Штучныя ўгнаеньні савгасы маюць. Самі савгасы сабралі попелу 60 цэнтн. і прымацаваныя да іх установы і арганізацыі 100 цэнтн.

У савгасе Межава сяўба пачалася яшчэ 13 мая. Трактары працуюць у дзьве зьмены і сеялкі таксама. У гэтым савгасе плошча яравых пасеваў пашыраецца на 4 проц., а пасеў ячменю—на 300 проц. супроць мінулага году. Усяго пад ярыной у гэтым годзе ў савгасе Межава будзе занята 241 гэктар на палёх, 18 у саду і 26 г. у гародзе. Бульбу сеяць савгас яшчэ не пачынаў.

Зімовыя ў гэтым савгасе вышлі з пад сьнегу кепскімі і толькі адно поле ідзе добра.

Намесьнік загадчыка савгасам Межава ня ведае што гэта такое сацыялістычнае спаборніцтва. Іх ніхто на спаборніцтва не выклікаў і яны таксама нікога. Але рабочыя працуюць добра і адносяцца да ўсёй працы і да гаспадаркі сьвядома і клапоцяцца аб палепшаньні становішча савгасу.

Наогул аб сацыялістычным спаборніцтве ў Аршанскай акрузе ўспомнілі позна і далі толькі ўказаньні райёнам арганізаваць спаборніцтвы.

Як ідзе сяўба наогул па акрузе, як выконваецца аграмінімум—зьвестак няма, але цяпер акруговы зямельны аддзел камандураваў у райёны працаўнікоў акругі для праверкі правядзеньня сяўбы і выкананьня плянаў яе.

А. Калюжны.

Пачаўся вучот аб'ектаў абкладаньня.

Ворша, 25-V. У акрузе пачалася праца па вучоту аб'ектаў абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам. Агітацыйная і растлумачальная праца па с.-г. падатку была праведзена ў вёсках яшчэ зімой і ў пачатку вясны. Да гэтага часу выяўлены кулацкія гаспадаркі, якія павінны будуць абкладацца падаткам у індывідуальным парадку. Усяго на акрузе адабрана 1429 кулацкіх гаспадарак, што складае 1,5 проц. агульнага ліку сялянскіх гаспадарак у акрузе. У ліку моцных гаспадарак аказалася і гаспадарка старшыні сельсавету з Круглянскага райёну: кулак пралез на старшынёю сельсавету. Цяпер гэтага старшыню зьнялі з працы і выключылі са складу сяброў сельсавету.

Трэба адзначыць, што бедната вельмі сьвядома і актыўна ўвесь час дапамагала выяўляць кулацкія моцныя гаспадаркі для абкладаньня індывідуальным падаткам. Як і ў мінулым годзе, кулакі ўжо пачынаюць скардзіцца, што іх няправільна аднесьлі да групы плацельшчыкаў індывідуальнага падатку.

Ва ўсіх райёнах ужо праведзены пленумы райвыканкомаў і нарады старшыняў сельсаветаў, на якіх разглядаўся новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку і інструкцыя аб яго правядзеньні.

На акруговай і райённых фінансавых нарадах запрапанавана ўсім райвыканкомам і сельсаветам зьвярнуць асаблівую ўвагу на поўнае выяўленьне ўсіх аб'ектаў абкладаньня.

А.

Завод керамічна-бэтоннай вытворчасьці.

Барысаў, 24-V. *Прэзыдыумам гарсавету ўзбуджана хадайнічаньне перад АВК аб водпуску 13500 руб. на вышукваючыя работы па пабудове керамічна-бэтоннага заводу.*

Будуем новую школу.

Сяляне в. Шычы, Калінкав. райён, Мазырскай акр., на агульным сходзе пастанавілі. пры пабудове ў гэтым годзе новай школы ў вёсцы, усе матар'ялы, якія патрабуюцца для пабудовы, цэмант, хвораст, гліну, цэглу, і лесаматар'ялы—даставіць у школу натурай, для чаго кожны селянін дае згоду адвесьці па некалькі гуж-дозаў або адпрацаваць некалькі дзён. Месца пад школу адводзіцца ў асяродзьдзі на сялённага пункту.

М.

Спыніце пасечку лесу.

(Самахвалавіцкі райён, Меншчына).

Дзяржаўны лес Дубова-Логскай дачы бязьлітасна высякаецца парубшчыкамі ня толькі ўначы, а нават і ўдзень.

На запытаньне ваколічных грамадзян, чаму гэтак зьнішчаюць народнае багацьце, кажуць, што лес зусім лясьніком не ахоўваецца, а лясьніцтва таксама не зьвяртае належнай увагі на гэта.

Трэба як хутчэй спыніць гэту бязьлітасную пасечку лесу.

Г.

АБ ПРАЦЫ З АГРАЎПАЎНАВАЖАНЫМІ.

(У парадку абмеркаваньня).

Інстытут аграпамічных упаўнаважаных утвораны згодна пастановы IV сэсіі ЦВК СССР па пытаньні аб узьняцьці ўраджайнасьці. Утварэньне інстытуту аграўпаўнаважаных мела на ўвазе ў першую чаргу ўтварыць з савецкага актыву вёскі такія кадры памоцнікаў спэцыялістам сельскае гаспадаркі, абапіраючыся на якіх зямельным органам і саветам было-б лягчэй правесьці цэлы шэраг самых простых агратэхнічных мерапрыёмстваў у сельскай гаспадарцы. Адначасова інстытут аграўпаўнаважаных **павінен дапамагчы** саветам і земорганам больш поўна высьветліць гаспадарчыя асаблівасьці кожнага райёну, вёскі і накіраваць гаспадарчую ініцыятыву шырокіх мас сялянства па належным лагву.

Згодна палажэньня, аграпамічныя ўпаўнаважаныя пасёлкаў і вёсак выбіраюцца на агульных сходах пасёлкаў і вёсак. Аграўпаўнаважанымі-ж камун, арцеляў, таварыстваў па грамадзкай апрацоўцы зямлі зьяўляюцца старшыні саветаў гэтых аб'яднаньняў.

Прыблізна на кожныя 10 двароў у пасёлку або вёсцы павінен быць адзін аграўпаўнаважаны і адзін кандыдат да яго. Аграўпаўнаважаны абіраецца на 2 гады, аднак можа быць раней адкліканы ў тым выпадку, калі ня выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі. Аграўпаўнаважаныя па сельсаветах вызначаюцца в ліку сяброў сельсавету прэзыдыумам апошняга. Пастанова агульных сходаў пасёлкаў і вёсак аб выбары аграўпаўнаважаных зацьвярджаюцца сельсаветамі, а аграўпаўнаважаныя па сельсаветах зацьвярджаюцца райвыканкомамі. Усе аграўпаўнаважаныя ўваходзяць у склад сельска-гаспадарчых камісій сельсаветаў.

Зусім зразумела, што, утвараючы інстытут аграўпаўнаважаных, у першую чаргу трэба дабіцца адпаведнага сацыяльнага складу аграўпаўнаважаных. Згодна палажэньня, ня могуць быць абранымі ў аграўпаўнаважныя асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў. Аднак, пры масавасьці аграўпаўнаважных (на Савецкую Беларусь павінна быць абрана тысяч 30—35) можа пралезьці **ў аграўпаўнаважаныя кулацка-заможны элемэнт.** Льготы, якія прадастаўляюцца аграўпаўнаважаным, права кантролю над правядзеньнем сялянствам найпрасьцейшых агракультурных палепшаньняў, удзел ў камісіях па вызначэньні пашкоджаньняў у сельскай гаспадарцы, удзел у камісіях па вучоту агракультурных палепшаньняў для прадстаўленьня льгот па сельска-гаспадарчым падатку, нарэшце, проста жаданьне сарваць цэлы шэраг мерапрыёмстваў па сельскай гаспадарцы (аграмінімум і інш.)—**усё гэта будзе дастатковым стымулам для напору на бядняцка-сераднякцкія масы сялянства з боку кулацтва, з мэтай пралезьці ў аграўпаўнаважаныя і дабіцца сваіх карысных ці шкодніцкіх намераў.** Адгэтуль пільная дбайнасьць беднаты, партыйных і камсамольскіх арганізацый, сельсаветаў для таго, каб склад аграўпаўнаважаных быў у поўнай меры савецкім і адпавядаў вырашэньню тых задач, якія на аграўпанаважаных ускладаюцца.

Вышэй мы адзначалі, што аграўпаўнаважаныя павінны быць асноўнымі кадрамі, на якія будуць абапірацца сельсаветы і земорганы ў правядзеньні ў першую чаргу агратэхнічных мерапрыёмстваў. Канкрэтна гэта павінна зьвесьціся да наступнага. Аграўпаўнаважаныя павінны пад кіраўніцтвам аграномаў высьвятляць умовы пры якіх найбольш пасьпяхова будзе праходзіць выконваньне абавязковых агракультурных палепшаньняў у сельскай гаспадарцы. Пры дапамозе аграўпаўнаважаных земорганы і сельсаветы павінны высьветліць якія мерапрыёмствы ў першую чаргу ў даным сяленьні трэба правесьці, якая агранамічная дапамога і дзе павінна быць аказана, у якіх сродках вытворчасьці мае патрэбы сялянства данага сяленьня. Адначасова аграўпаўнаважаныя ажыцьцяўляюць кантроль за правядзеньнем абавязковых агракультурных палепшаньняў (закон аб аграмінімуме), даюць зьвесткі аб нявыконваньні гэтага закону і г. д. Вучот фактычна праведзеных агракультурных палепшаньняў, як і арганізацыя іх правядзеньня ляжыць на аграўпаўнаважаных.

Абавязкі, як быццам, простыя але у той жа час складаныя. Кожны агранамічны ўпаўнаважаны для выконваньня сваіх абавязкаў павінен мець некаторы мінімум ведаў па сельскай гаспадарцы, які адначасова павінен перавышаць веды звычайнага радавога сялянства. Адсутнасьць увязкі школы з вытворчасьцю ў дарэвалюцыйны час. слабая ўвязка вясковым школ з сельскаю гаспадаркаю ціпер—абязвае нас шукаць іншых шляхоў для агранамізацыі сялянства. Гэтыя шляхі, зразумела, ёсьць, мы іх ужо выкарыстоўваем, але-ж яшчэ ў недастатковай меры, і калі агранамізацыя сялянства зараз ёсьць цэнтральная задача, то агранамізацыя аграўпаўнаважаных—першая і галоўнейшая частка гэтай задачы. Аграўпаўнаважаны-ж бліжэйшы памоцнік агранома ў вёсцы. Трэба, каб гэты памоцнік меў дастатковыя веды, каб вучыць і дапамагаць сялянам. Зараз, значыць, пасьля ўтварэньня інстытуту аграўпаўнаважаных рубам ставіцца пытаньне аб работе з імі. **Без належнай работы па агранамізацыі аграўпаўнаважаных мы патрэбных нам вынікаў не атрымаем.**

Якая-ж работа з аграўпаўнаважанымі павінна праводзіцца?

Першай умовай для нармальнай работы аграўпаўнаважаных—гэта **правільнае выкарыстаньне іх.** У шэрагу месц аграўпаўнаважаныя, замест сваіх простых абавязкаў, выкарыстоўваюцца для пераліскі папер у сельсаветах, аховы маемасьці пракатных пунктаў і г. д. Падобная загрузка работай, якая ня мае да аграўпаўнаважанага ніякіх адносін, толькі зрывае іх нармальную работу. Тут трэба са ўсёй жорсткасьцю зьмяніць адносіны да аграўпаўнаважаных і строга прытрымлівацца пастановы Саюзнага ЦВК.

Другой умовай трэба лічыць **забясьпечаньне аграўпаўнаважаных неабходнай папулярнай літаратурай.** Кожны аграўпаўнаважаны павінен мець у сябе галоўнейшыя пастановы ўраду, законы аб падняцьці ўраджайнасьці, закон аб аграмінімуме, а таксама лістоўкі і брашуры па ўсіх простых агратэхнічных мерапрыёмствах. Літаратура на першых часох павінна быць дадзена аграўпаўнаважаным бясплатна.

Трэцяя ўмова—**арганізацыя спэцыяльных сельска-гаспадарчых кароткатэрміновых курсаў для аграўпаўнаважаных.** У нас узімку звычайна праводзіцца для сялянства шмат розных курсаў.

У гэтым годзе праз сельска-гаспадарчыя курсы прапушчана 16.000 ч. сялян. Калі немагчыма будзе адшукаць сродкі на спэцыяльныя курсы для аграўпаўнаважаных, то трэба прыняць меры, **каб на курсы, якія будуць арганізаваны земорганамі для сялянства, у першую чаргу папалі аграўпаўнаважаныя.**

Чацьвертая ўмова — **абавязковы ўдзел усіх аграўпаўнаважаных у працы сельск.-гаспадарч. камісій пры сельсаветах.** Да гэтага часу камісіі працавалі слаба. Трэба дабіцца, каб гэтыя камісіі пры сельсаветах сталі сапраўды вытворчымі нарадамі па пытаньнях сельскай гаспадаркі.

Пятая ўмова—**правядзеньне пэрыядычных сходаў аграўпаўнаважаных для інструктаваньня, падвядзеньня вынікаў работы, абмену вопытам работы ў розных селішчах, калгасах, арцелях, пасёлках.** У сувязі з тым, што райённыя сходы аграўпаўнаважаных будуць вельмі грамоздзкія, відаць, прыдзецца праводзіць гэтыя сходы па сельсаветах.

Шостая ўмова—**арганізацыя экскурсій для аграўпаўнаважаных на вопытныя станцыі, вопытныя палі,** аграпункты, калгасы, савгасы і г. д. Практыку экскурсій трэба як мага пашырыць, тым больш, што ў нас у сельскай гаспадарцы, асабліва ў сацыялістычным сэктары, ёсьць шмат дасягненьняў, пра якія павінна ведаць усё сялянства і ў першую чаргу аграўпаўнаважаныя.

Пералічаныя моманты работы з аграўпаўнаважанымі далёка ня вычэрпваюць усіх відаў рабаты. Практыка, бясспрэчна, пакажа нам новыя формы, больш цікавыя і эфэктыўныя. **Зараз, напрыклад, пры разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, конкурс на лепшага аграўпаўнаважана будзе зусім сваечасовым.**

Ва ўсёй рабоце з аграўпаўнаважанымі важна, каб земорганы і спэцыялісты сельскае гаспадаркі выразна зразумелі ўсё значэньне і важнасьць інстытуту аграўпаўнаважаных. Калі такое разуменьне будзе, то посьпех работы аграўпаўнаважаных будзе забясьпечан.

Само сабой зразумела, што партыйная арганізацыя ў вёсцы (Райкомы КП(б)Б, ячэйкі партыі і камсамолу) у цэнтры сваёй увагі павінны мець як работу аграўпаўнаважаных, так і работу з імі. Палітычнае выхаваньне аграўпаўнаважаных павінна быць абавязкам нашых партыйных арганізацый у вёсцы. Утварыўшы такі вялікі інстытут аграўпаўнаважаных у некалькі дзесяткаў тысяч чалавек, нельга прадаставіць іх самім сабе, або спэцыялістам, няхай і добра—пасавецку настроеным. З аграўпаў

САЮЗ НАВУКІ І ПРАЦЫ СУПРОЦЬ РЭЛІГІІ.

200 навуковых працаўнікоў БДУ аб'ядналіся ў ячэйку „Бязбожнік" для рашучай барацьбы з рэлігійным дурманам.

Ячэйка выклікала на спаборніцтва па антырэлігійнай барацьбе ўсе навуковыя і навукова-дасьледчыя ўстановы Беларусі.

Навука і праца пераможа.

У барацьбе, якая ў апошнія гады значна абвастрылася, наш клясавы вораг групуецца і яднаецца ў царкоўных арганізацыях; рэлігія, як і заўсёды, зьяўляецца для яго галоўнай зброяй барацьбы супроць пралетарскай дзяржавы, супроць будаўніцтва сацыялізму.

Моцнай зброяй з нашага боку на гэтым фронце барацьбы з імі зьяўляюцца веды, укараненьне ў шырокія пласты рабочых і сялян ведаў сьветатварэньня і жыцьцёвых працэсаў—з аднаго боку, з другога боку—жыцьця чалавечай грамады, словам, разуменьня ўсяго таго, што дае нам сучасная навука ва ўсіх яе галінах.

Разуменьне законаў сьветатварэньня і жыцьцёвых працэсаў з дастатковай яскравасьцю высьвятліць, што ў прыродзе няма ніякіх напрыродных сіл, што няма мейсца ні багам, ні д'ябалам, што ўсе працэсы, усе зьявішчы ўтвараюцца згодна прыродным законам.

Разуменьне законаў разьвіцьця чалавечай грамады ў сваю чаргу павінна вытлумачыць, што зараджэньне веры ў багоў і разьвіцьцё розных рэлігій цесна зьвязана з разьвіцьцём чалавечай грамады, што багоў і д'ябалаў утварыў сам чалавек у сваім уяўленьні ў адпаведнасьці са стадыяй разьвіцьця яго творчасьці.

Веды выб'юць з рук прадстаўнікоў буржуазіі адзін са сроднаў барацьбы з намі.

Вось чаму ЦССББ горача вітае вучоных і наогул выкладчыкаў БДУ, якія зрабілі пачын і выявілі наўкільнае рашэньне весьці рашучы наступ на нашых ворагаў на рэлігійным фронце, на тым вучастку барацьбы, на якім абнаваліся нашы клясавыя ворагі.

Навука—самая магутная зброя супроць забабонаў і рэлігійнага дурману; веды—самае радыкальнае лячэньне ад атруты, якой труюць рабочых і сялян прадстаўнікі ўсіх рэлігій.

Навука і праца—адзіны фронт вучоных з рабочай клясай, зьнішчыць ворага ня толькі на рэлігійным вучастку барацьбы, але забясьпечыць таксама перамогу і на ўсіх франтох будаўніцтва сацыялізму.

ПРЭЗЫДЫУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ СБ БЕЛАРУСІ.

Паслужым прыкладам для студэнцтва

У сучасны момант на фронце сацыялістычнага будаўніцтва мы разгарнулі шырокую працу. Ворагі савецкай улады і дыктатуры пралетарыяту напружваюць усе сілы, каб затрымаць гэта будаўніцтва, ня даць магчымасьці рэканструіраваць нашу гаспадарку, узьняць культуру і пабудаваць жыцьцё на новых бытавых началах. Асабліва яскрава апазіцыя дыктатуры пралетарыяту адбіваецца на ідэёвым фронце. Ворагі працоўных мас, зразумела, ні ў якім разе ня могуць быць прыхільнікамі дыялектычна-матэрыялістычнага сьветапогляду. Замест гэтага яны высоўваюць на першы плян рэлігійныя погляды і вядуць у гэтым напрамку надзвычайна шырокую агітацыю, якой працоўныя масы павінны даць адпаведны адпор.

БДУ, выпускаючы са сваіх муроў розных спэцыялістых, якія павінны стаць практычнымі і культурнымі работнікамі ў гушчы працоўных у сыстэме сацыялістычнага будаўніцтва займае асаблівае месца. Унівэрсытэт павінен зьвярнаць асаблівую ўвагу на тое, каб наша студэнцкая моладзь уступала ў жыцьцё ўся прасякнутая дыялектычна - матэрыялістычным сьветапоглядам. Вось чаму унівэрсытэт павінен заняць важнае месца на фронце барацьбы з варожай ідэалёгіяй і асабліва з рэлігійнымі настроямі насельніцтва. Калі нашы студэнты будуць пакідаць унівэрсытэт ня зусім цьвёрдыя ў матэрыялістычным сьветапоглядзе, дык яны лёгка могуць трапіць пад уплыў варожых працоўным масам ідэалёгій зрабіцца прыхільнікамі рэлігійных поглядаў. Пры такіх умовах унівэрсытэт выпускаў-бы ворагаў Савецкай улады. Зразумела, гэтага ня можа быць.

Пры унівэрсытэце заснавалася ячэйка бязбожнікаў. Праца ўнівэрсытэцкай ячэйкі бязбожнікаў павінна быць узорнай, бо ніводная ячэйка бязбожнікаў ня будзе мець такіх навуковых сіл, як ячэйка унівэрсытэту. Зразумела, на яе будуць глядзець працоўныя масы, і ёй прыдзецца выйсьці за муры унівэрсытэту і пачаць шырокую антырэлігійную працу сярод насельніцтва. Праца ячэйкі бязбожнікаў павінна мець асаблівае значэньне і ў справе выхаваньня нашага студэнцтва. Той, хто зьвязаў сябе з працоўнымі масамі, павінен ня толькі на словах, але і на справе паказаць сваю шчыльную сувязь з працоўнымі масамі. Уваход яго ў ячэйку бязбожнікаў зьявіцца навочным паказчыкам яго сувязі з працоўнымі масамі. Вось чаму нельга ня прызнаць нечаканым той факт, што некаторыя асобы, якія выкладаюць прыродазнаўчыя і мэдычныя навукі і па зьместу сваёй працы павінны выхоўваць антырэлігійны сьветапогляд, адмовіліся ўвайсьці ў ячэйку бязбожнікаў. Сваім адказам яны паказалі няўстойлівасьць свайго сьветапагляду. Гэта няўстойлівасьць можа зрабіць дрэнны ўплыў на нашу моладзь. Прафэсары і выкладчыкі унівэрсытэту павінны заняць актыўную пазіцыю на антырэлігійным фронце, паказаць, што яны зьяўляюцца прыхільнікамі пралетарскага сьветапагляду. Іншая пазіцыя ў гэтым напрамку будзе сьведчыць аб тым, што так званая інтэлігэнцкая праслойка яшчэ ня выявіла сябе і за 11 год Кастрычнікавай рэвалюцыі, што яна ня ведае на чый бок стаць.

Мы ўпэўнены ў тым, што паасобныя выпадкі неўваходу ў ячэйку бязбожнікаў ёсьць толькі непаразуменьне, якое будзе ліквідавана ў бліжэйшыя часы.

Ворагі працоўных мас сталі надзвычайна актыўнымі. Мы таксама павінны стаць актыўнымі, каб на рэлігійную прапаганду адказаць антырэлігійнай прапагандай. Мы павінны скарыстаць усе нашы навуковыя сілы, аб'яднаць іх вакол ячэйкі бязбожнікаў і шпарка разгарнуць сваю працу.

Толькі тады мы зможам быць упэўнены ў тым, што наша барацьба дасьць станоўчыя вынікі, а наша студэнцкая моладзь, бачучы, якую пазіцыю займае на антырэлігійным фронце прафэсура і іншыя выкладчыкі, пад прыкладам гэтага будзе выхоўвацца ў сваім антырэлігійным сьветапоглядзе.

Мы павінны разгарнуць антырэлігійную працу на Беларусі яшчэ па чыста мясцовых прычынах. Тут на Беларусі сустракаліся розныя рэлігіі. Пад рэлігійным сьцягам вялося ўпартае нацыянальна-эканамічнае змаганьне. Пад рэлігійным сьцягам утварылася бязьлітасная эксплёатацыя працоўных мас.

Пад рэлігійным сьцягам затрымлівалася разьвіцьцё культурнасьці народнай масы. Ячэйка бязбожнікаў павінна на ўсё гэта зьвярнуць увагу і высьветліць перад усімі працоўнымі сапраўдную сутнасьць кожнай рэлігіі, як сьветапогляду пануючай клясы.

Старшыня бюро ячэйкі «Бязбожнік» БДУ Ул. ПІЧЭТА.

Усебеларускія антырэлігійныя курсы.

Цэнтральны Савет Т-ва Бязбожнікаў арганізуе Усебеларускія курсы для падрыхтоўкі кадраў прапагандыстаў-райённых і на прадпрыёмствах.

Праграма курсаў разьлічана на адзін месяц; на курсы з усіх округ БССР выклікаецца 40 чалавек актыву таварыства. Праца на курсах распачнецца 6 чэрвеня. Курсанты будуць забясьпечаны поўным утрыманьнем, а за рабочымі захоўваецца сярэдні месячны заработак.

Лектарамі на курсы запрошаны праф. Вальфсон, рэктар камвузу Сянкевіч, акадэмік Матулайціс, дацэнт БДУ Усьпенскі і інш.

Ячэйка бязбожнікаў пры БДУ.

Ініцыятыўная група па арганізацыі ячэйкі бязбожнікаў у колькасьці 25 чалавек навуковых працаўнікоў склалася яшчэ ў сакавіку месяцы. У ячэйку завербавана больш 200 супрацоўнікаў Унівэрсытэту, з іх 23—прафэсары, 112—навуковых працаўнікоў (дацэнты, асыстэнты, выкладчыкі і інш.) і рэшта тэхнічныя працаўнікі. У бюро ячэйкі ўваходзіць: 4 прафэсары, 2 дацэнты, 2 асыстэнты, 4 выкладчыкі і ардынатары, 1 асьпіранты і тэхнічныя працаўнікі.

У красавіку месяцы г. г. адбыўся спэцыяльны арганізацыйны сход бязбожнікаў. На гэтым сходзе прысутнічала каля 300 працаўнікоў БДУ. Сход прайшоў надзвычайна цікава, прычым на сходзе прысутнічалі нават такія навуковыя працаўнікі, якія наогул слаба наведваюць сходы па іншых пытаньнях.

Ячэйка „Бязбожнік" правяла антырэлігійны месячнік. Прафэсары і навуковыя працаўнікі прачыталі на антырэлігійныя тэмы 26 лекцый, з іх: клюб імя Леніна--пасажырская МБВ-5, МБВ чыгунка таварная—4, шклозавод „Пралетары" —1, вёска—3, рабфак—1, падшэфная вайсковая часьць—7, БДУ—5. Апрача таго, бюро ячэйкі „Бязбожнік" арганізавала ў вялікодныя дні, 4-га і 5-га мая, спэцыяльныя экскурсіі чырвонаармейцаў у навуковыя ўстановы Унівэрсытэту, (арганічная хэмія, гісталёгія, рэнтгенаўскі інстытут, нэрвовая клініка, зоолёгія і інш.), дзе прафэсары БДУ прачыталі для чырвонаармейцаў спэцыяльныя лекцыі на антырэлігійныя тэмы з дэманстрацыяй навуковых вопытаў (наведала больш 300 чырвонаармейцаў).

У сучасны момант ячэйка разгортвае вялікую працу. Правяла 5-га мая антывялікодны вечар, на якім прысутнічалі ня толькі працаўнікі БДУ, але і Беларускай Акадэміі Навук, Камвузу і Навукова-Дасьледчага Інстытуту. На гэтым сходзе былі заслуханы даклады прафэсароў: Пічэты, Нікольскага і дацэнта Усьпенскага і прынята дэклярацыя, якую падпісалі 42 прафэсары; 33 дацэнты, 26 асыстэнтаў, 12 ардынатараў, 15 асьпірантаў, 45 выкладчыкаў і г.д.

Ячэйка выклікала на спаборніцтва па антырэлігійнай працы Беларускую Акадэмію Навук, Навукова-Дасьледчы Інстытут імя Леніна, Беларускую Сельска-Гаспадарчую Акадэмію, Вэтэрынарны Інстытут, усе тэхнікумы БССР і навукова-навучальныя ўстановы СССР. Ячэйка штодня абслугоўвае рабочых пасажырскай і таварнай МБВ чыгункі, падшэфную вайсковую часьць і інш. прадпрыёмствы і ўстановы г. Менску, а таксама наладжвае спэцыяльныя выезды ў вёску.

Ячэйка „Бязбожнік" адчыняе антырэлігійны музэй у мурох унівэрсытэту, арганізавала лектарскае бюро ў ліку 50 навуковых работнікаў, члены ячэйкі—навуковыя працаўнікі—рыхтуюць брашуры на антырэлігійныя тэмы. З пачатку новага навучальнага году будзе арганізаваны спэцыяльны антырэлігійны унівэрсытэт. Побач з гэтым, ва ўсіх выкладаемых ва ўнівэрсытэце дысцыплінах адпаведнае месца будзе займаць антырэлігійны момант.



Антырэлігійная дэклярацыя навуковых працоўнікоў, прынятая 5-га мая г. г.

Мастацтва ў барацьбе з рэлігіяй.

У антырэлігійнай працы зьвяртаецца вельмі вялікая ўвага на ідэалёгічны бок; барацьба ідзе за замену рэлігійнага сьветапогляду сьветапоглядам навуковым. Але-ж гэта толькі адзін, хоць і надзвычайна важны вучастак барацьбы; нясупынна працягваючы на гэтым вучастку энэргічную падрыўную работу, мы не павінны забываць другога, ня менш важнага вучастку. Навуковае вывучэньне складаных элемэнтаў рэлігіі ўстанавіла, што адна з мацнейшых пазіцый рэлігіі—гэта культ.-рэлігійная практыка. Радавы рэлігійны чалавек цэніць рэлігію за тыя эмоцыі, якія яна яму дае. Няма патрэбы напамінаць, што ў кульце рэлігія мае найбольш магутную зброю панаваньня над людзьмі і ў гэтай сфэры яна шырока скарыстала ўсе віды мастацтва: паэзію, слова, музыку і пяяньне, малярства, будаўніцтва і разьбярства. Сьвядома ці несьвядома, але-ж царкоўныя кіраўнікі самых розных часоў і вызнаньняў імкнуцца да таго, каб пэрамоніямі культу так увядзейнічаць на веруючага, каб ён адчуваў слабе перанесеным у іншы сьвет, нікольскі не падобны да штодзённага сьвету, ад якога набожны аддзелен мурамі царквы. Разнавіднасьць эмоцый, якая ўтвараецца гіпнозам культу, зьяўляецца адным з прыцягваючых момантаў кожнай рэлігіі.

На барацьбу з рэлігіяй мы павінны знайсьці такую зброю, якая магла-б ня толькі зьнішчыць прывабнасьць рэлігійнага гіпнозу, але і даць штосьці ўзамен, бо рэлігія тут грае на патрэбе чалавечай прыроды ад штодзённых клопатаў, з мэханічнымі зьменамі работы і адпачынку, кожны з нас хацеў-бы хоць на кароткі тэрмін пайсьці кудысьці туды, дзе ўсё па-іншаму, дзе наша пачуцьцё, нашы думкі, нашы нэрвы атрымаюць зусім іншы напрамак. У барацьбе з рэлігіяй мы павінны разьвязаць праблему такога безрэлігійнага асьвяжэньня нашай нэрвовай сыстэмы і зрабіць гэта так, каб нашы мерапрыёмствы мелі магчымасьць канкураваць з рэлігійнымі спосабамі, як па сваім масавым характары, так і па сіле свайго дзейнічаньня.

Гэта праблема адчуваецца, яе ўжо вобмацкам прабуюць вырашыць, але-ж яна яшчэ не пастаўлена ў поўнай меры. Мы маем на ўвазе гэткія вопыты, як акцябрыны, клюбныя і вулічныя пастаноўкі, сьвята ўраджаю, нарошце, грамадзкія пахаваньні. Гэтыя апошнія хутчэй і мацней увайшлі ў быт і адціснулі на задні плян царкоўныя пахаваньні ня толькі ў горадзе, а і ў вёсцы

Мы павінны кінуць лёзунг: мастацтва супроць рэлігіі. Яно служыла раней рэлігіі, дапамагала ёй уносіць дурман у масы; яно можа і павінна цяпер служыць вызваленьню людзей ад гэтага дурману.

У кароткай газэтнай заметцы няма магчымасьці вызначыць тыя шляхі, па якіх тут трэба ісьці; гэта задача патрабуе шырокага калектыўнага абгаварэньня. Мы хацелі-б толькі заўважыць, што справа гэта зусім ня зводзіцца толькі да таго, каб канкураваць з рэлігійнымі сьвятамі шляхам устанаўленьня мастацка - паладжаных сьвятаў. Сьвяты павінны ў той ці іншай форме адзначаць перамогі навукі і тэхнікі, уздымаючы чалавечую годнасьць і веру ў творчыя сілы чалавечай прыроды. Але гэта адна і не галоўная лінія. Галоўнае—разьвіцьцё масавага мастацкага відовішча, якое павінна быць пастаўлена так, каб яно давала неабходныя зьмены нэрвовай сыстэмы і зрабіла непатрэбным рэлігійны гіпноз.

Тут—дзьве лініі антырэлігійнай прапаганды: барацьба з алкагалізмам і—за культурную рэвалюцыю ўцалку. Надзвычайныя магчымасьці ў барацьбе з рэлігіяй захаваны для нас у кіно.

Мы заклікаем выказацца па ўзьнятым намі пытаньні працаўнікоў мастацтва, літаратуры, палітыкаў і прадстаўнікоў навукі — раней усяго мэдыкаў і фізыялёгаў.

Праф. Н. НІКОЛЬСКІ.

Антырэлігійную працу—на фабрыкі і заводы.

Пачатая барацьба за пралетарскую ідэалёгію ў сучасны момант асабліва патрабуе накіраваць гэту барацьбу супроць рэлігійнага дурману.

Зараз у нас разгорнута шырокая праца на антырэлігійным фронце. Рабочыя зразумелі шкоднасьць рэлігіі ўсіх водценяў. Пры клюбах арганізуюцца куткі бязбожнікаў, выносяцца на агульных сходах прапановы працаваць у сьвяты, зачыняць цэрквы, сынагогі, касьцёлы і прыстасоўваць іх для культурных устаноў.

Вельмі важнае значэньне мае тое, што навуковыя працаўнікі Беларусі арганізавана выступаюць на ідэолёгічным фронце, супроць рэлігіі—гэтага дурману рабоча-сялянскай масы. Трэба будзе, каб навуковыя працаўнікі ўсе свае веды ў гэтым напрамку перанеслі на фабрыкі і заводы, каб у гутарках з рабочымі на падставе навуковых даных давесьці рабочым, што рэлігія стварылася царамі ў інтарэсах пануючай клясы, што рэлігія затрымлівае тэмп нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Прафсаюзы са свайго боку павінны дапамагаць куткам бязбожнікаў сродкамі, а таксама садзейнічаць навуковым працаўнікам праводзіць антырэлігійную працу на фабрыках, заводах і г. д. Бібліятэкі і клюбы павінны ўключыць у плян сваёй працы элемэнты барацьбы з рэлігійным дурманам.

Чыгуначны пралетарыят у гады грамадзянскай вайны ў холадзе і голадзе, пасьля 8-мігадзіннага дню працы ішоў на суботнік, каб хутчэй аднавіць разбураны чыгуначны транспарт. Чыгуначнікі зьявіліся застрэльшчыкамі суботнікаў. І цяпер, калі клясавы вораг пад маскай рэлігіі імкнецца пашкодзіць рабочай клясе будаваць сацыялізм, чыгуначнік таксама пойдзе ўперадзе і на антырэлігійным фронце.

Ф. Ісаеў.

Стары бязбожнік.

(Калінкавіцкі раён, Мазыршчына).

Даўно ўжо ня верыць у бога селянін вёскі Гарочыцы Зіновіч Павал, але абразы ў куточку ўсё-ж яшчэ вісяць. Ня раз зьбіраўся ён ачысьціць гэты куточак, але жонка не дапускала. Сам Зіновіч П.—бязбожнік, дзеці—камсамольцы і піянэры і толькі жонка Паўла—набожная кабеціна.

Шмат гаворкі было паміж Паўлам і жонкаю аб багох, аб рэлігіі, але справа апрацоўкі няпісьменнай жанчыны пасоўвалася марудна. Павал выступае на сходах, Павал агітуе супроць сьвят, а ў самога абразы на-куце.

Прачытаў Павал у газэце, што дзесь пад Менскам сямідзесяцігадовы дзед запісаўся ў бязбожнікі. Прачытаўшы допіс, Павал паглядзеў на абразы і задумаўся. «Да 1923 г. маліўся ім, выстойваючы па гадзіне рана і вечарам, век быў гарамыкай-бедняком і нічога бог ня даў—падумаў Павал,—дык навошта-ж яны будуць яшчэ і цяпер тут вісець?"

— Як ты сабе хочаш, а я гэтых ідалаў павыкідаю,—кажа Паўла жонцы і палез у куток.

На гэты раз жонка Паўла не спрачалася, бо бачыла беспаваротны настрой Паўлы, а падругое, і сама яна думала аб тым, што багі нічога карыснага не даюць.

Багі Паўла паехалі ў печку.

Павал ня спыніўся толькі на сваіх багох, а вечарам, сабраўшы сваіх суседзяў-беднякоў, пачаў даводзіць, якую шкоду рабіла рэлігія бедняку на вёсцы.

Паўла—не пустамол, а аўтарытэтны вясковы працаўнік, і яго словы таксама аўтарытэтны сярод вясковай беднаты. Паўла ня ведае гісторыі і не ўладае краснамоўствам, але ён кароткa і цьвёрда можа расказаць сялянам тое, што ведае сам. І вось, яго гутарка аб рэлігіі з беднатой мела такі вынік: шэсьць бяднякоў да дню першамайскага сьвята ачысьцілі свае хаты ад багоў.

Лявонік В.

Дакладныя навукі ня мірацца з рэлігіяй.

Некаторыя навуковыя працаўнікі, асабліва ў галіне прыродазнаўства і мэдыцыны, лічаць сябе ў праве разважаць такім чынам: У галіне сваёй навукі я патрабую для кожнага палажэньня цьвёрдых навуковых даводаў. Толькі ў такім выпадку яно для мяне абавязкова, я з ім лічуся. Іншая справа рэлігія: яна—катэгорыя не навукі, а веры. І паколькі я не магу навукова давесьці, што бога няма, а гэта-ж справа не прыродазнаўцы, а філёзафа!—паколькі я пры дапамозе мікраскопу не магу пераканацца ў тым, што бога няма, пытаньне для мяне застаецца па меншай меры адкрытым.

Фармальна ва ўсім гэтым разважаньні адчуваецца недарэчная фігура сафізму аб рагох: што я згубіў, таго ня маю; рогаў я ня згубіў, значыцца я маю рогі. Па сутнасьці-ж усе паказаныя вышэй разважаньні знаходзяцца ў вялікай супярэчнасьці з сучасным узроўнем ведаў. Прыродазнаўства і мэдыцына могуць гапарыцца сваімі посьпехамі. Электрычнасьць. радый, ужываньне яго ў мэдыцыне, вывучэньне мазгавых клетак, узбуджальнікаў хвароб, хімія тканін і яе роля ў функцыі арганізму і г. д.—усё гэта досыць вядома. Але наўрад ці ня большым прагрэсам зьяўляецца сьвядомасьць, што межы паміж жывой прыродай і мёртвай, паміж несьвядомым і сьвядомым і г. д.—зусім даступны нашаму вывучэньню ў той час, як яшчэ параўнаўча нядаўна аб іх пісалі выдатныя вучоныя, што яны ніколі ня будуць даступны нашаму разуменьню. Аказалася, што тут няма нічога таемнага; „надпрыроднага", для тлумачэньня чаго навука прынцыпова няздатна.

Возьмем для прыкладу чалавечае мышленьне. Дасьціпнымі вопытамі Кёлер давёў, што зачаткі яго знаходзяцца ўжо ў малпаў. Розьніца абумоўліваецца р о з ь н і ц а й асяродзьдзя. Прынцып эвалюцыі, разьвіцьцё адных форм з другіх набывае агульную значнасьць у гісторыі чалавецтва, у жывой і мёртвай прыродзе. Але прызнаць яго—гэта значыць безагаворачна адмовіцца ад дапушчэньня надпрыроднага ўмяшаньня, хоць гэта будзе стварэньне сьвету ці кіраўніцтва жыцьцём людзей усяго сьвету. Недарма амэрыканскія буржуа забаранілі выкладаньне вучэньня Дарвіна аб разьвіцьці. Яны зусім слушна знайшлі ў ім вялікую небясьпеку для рэлігіі. Аднак, навукова мыслячы прыродазнаўца і доктар, вывучаючы законы прычыннасьці зьявішчаў, ня можа і не павінен згадзіцца з якой бы та ні было мэтафізыкай, абмяжоўваючай яго дасьледчы парыў. Яшчэ менш з гэтым можа згадзіцца дасьледчык—настаўнік падрастаючага пакаленьня. У барацьбе супроць усякай мэтафізыкі і рэлігіі, перашкаджаючай паступальнаму ходу навукі, ён павінен знаходзіцца ў першых шэрагах.

Праф. М. КРОЛЬ.

Трэба ўтварыць Беларускі Антырэлігійны Унівэрсытэт.

Антырэлігійная праца ўваходзіць у сучасны момант у такую паласу, што ўтварэньне кадру актыўных, філёзофскі-адукаваных, уладаючых неабходнымі навукова-прыродазнаўчымі ведамі прапагандыстаў,—зьяўляецца пытаньнем першачарговай важнасьці ў справе барацьбы з рэлігіяй.

Рэлігія мае на сваім баку сотні тысяч служыцеляй рэлігійнага культу, наспэцыялізаваных у схаластычнай рэлігійнай „мудрасьці", мае дзесяткі тысяч сэктанскіх казальнікаў, мае вялізарныя кадры прафэсыяналаў сваёй справы, добра ведаючых псыхалёгію шырокіх мас, умеючых скарыстоўваць дзеля сваёй мэты сацыяльную абстаноўку, умеючых пралезьці ва ўсе клясавыя шчыліны, якія ўтвараюцца ў краіне.

Наша задача, задача ваяўнічых бязбожнікаў, супроцьпаставіць гэтай арміі ад'ютантаў госпада-бога кваліфікаваны, навукова падрыхтаваны, уладаючы мэтодыкай антырэлігійнай працы кадр прапагандыстаў. На адных лёзунгах, што «рэлігія—опіум для народа», далёка не заедзеш. Ворага трэба біць фактамі—фактамі з гісторыі рэлігійных вераваньняў і культаў, фактамі з прыродазнаўства,—яго трэба біць востраадточанай зброяй матэрыялістычнай дыялектыкі. Такога роду арміі антырэлігійных байцоў мы ня маем. Яе трэба ўтварыць...

Першым імкненьнем да гэтага зьяўляюцца ўтвараемыя Цэнтральным Саветам Бязбожнікаў Беларусі летнія курсы, але гэтага мала. Гэта трэба разьвіць, пашырыць, паглыбіць.

Вось чаму Цэнтральны Савет Сэкцыі Навуковых работнікаў БССР і Бюро ячэйкі Бязбожнікаў БДУ парашылі ўтварыць з будучага акадэмічнага году Беларускі Антырэлігійны Унівэрсытэт.

Беларускі Антырэлігійны Унівэрсытэт павінен стаць адным з апорных пунктаў ваяўнічага бязбожніцтва ў барацьбе з рэлігійнай рэакцыяй. Да ўдзеду ў працы Унівэрсытэту павінны быць прыцягнуты лепшыя навуковыя сілы Беларусі. Павінны быць утвораны максымальна-спрыяючыя ўмовы для яго працы. Яго слухачы павінны быць выбраны з самай фабрычна-заводзкай і сялянскай гушчы. Яго дзьверы павінны быць шырока расчынены для юных асноўных студэнцкіх кадраў, для ўсіх, хто пажадае далучыцца да актыўнай антырэлігійнай працы.

Мы цьвёрда спадзяёмся, што ідэя ўтварэньня Беларускага Антырэлігійнага Унівэрсытэту сустрэне сапраўднае падтрыманьне з боку ўсёй беларускай савецкай грамадзкасьці, у першую чаргу нашага Цэнтральнага Савету Бязбожнікаў.

Старшыня Сэкцыі Навуковых Работнікаў БССР
Праф. С. Я. ВАЛЬФСОН.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД БЯЗБОЖНІКАЎ.

Да 4-5 чэрвеня па ўсіх округах Беларусі адбудуцца округовыя канфэрэнцыі Т-ва Бязбожнікаў. 6 чэрвеня ў Менску адбудзецца адчыненьне Усебеларускага Зьезду Бязбожнікаў. Галоўныя пытаньні зьезду —справаздача часовага Цэнтральнага Савету Т-ва, антырэлігійная праца і друк, антырэлігійная праца ў школах і шэраг іншых.

Пэдфак у антырэлігійнай барацьбе.

У сувязі з абвастрэньнем клясавай барацьбы, разам з наступам кулака і нэпмана на сацыялістычны сэктар нашай гаспадаркі заўважваецца зараз абвастрэньне барацьбы і на фронце ідэалёгічным. Прабуюць варушыцца царкоўнікі ўсялякіх масьцей, пераходзіць у наступ папоўства, разьвіваюць сваю дзейнасьць сэктанты і г. д.

Гэтым натугам царкоўнікаў неабходна процідаставіць адзіны і аб'яднаны фронт бязбожнікаў, папоўшчыне неабходна нанесьці рашучы ўдар.

У авангардзе барацьбітоў на антырэлігійным фронце павінны ісьці навуковыя працаўнікі. Сапраўдная навука, узброеная мэтадам дыялектычнага матэр'ялізму, і дурман рэлігіі не сумясьцімы. Яны ня мірацца паміж сабой, як ня мірыцца сонечнае сьвятло і густы змрок ночы. Уся гісторыя чалавецтва, чалавечай думкі выяўляе гэту процілегласьць навукі і рэлігіі. Яна паказвае, што рэлігія заўсёды была апорай абскурантызму і невуцтва. Досыць прыпомніць толькі жудасныя вогнішчы інквізыцыі, якая душыла свабодную навуковую думку, каб уявіць сабе ўсю агідную ролю рэлігіі, як ворага прагрэсу і навукі.

І зараз толькі ў СССР, толькі дзякуючы Кастрычнікавай рэвалюцыі, навука вызвалена з капцюроў ганебнага ўтарытарнага царкоўнага мышленьня. З тым большай рашучасьцю і энэргіяй гэта вызваленая навука можа накінуцца на свайго спрадвечнага ворага—рэлігію і царкву.

У працэсе ўзмацненьня антырэлігійнай барацьбы вялікую ролю павінен адыграць Пэдагагічны факультэт Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. Пэдфак, праўда, ніколі не забываўся на тое, што ён павінен рыхтаваць чырвонага настаўніка-бязбожніка, што толькі такі настаўнік можа быць сапраўдным культурным асьветным працаўніком, можа быць належным выхавальцам падрастаючага пакаленьня. Але ў сучасны момант антырэлігійная барацьба зьяўляецца настолькі актуальнай задачай, што яе трэба асабліва высунуць на першы плян. Каб з гонарам служыць вялікай справе культурнай рэвалюцыі. Пэдфак павінен усе свае сілы аддаць антырэлігійнай барацьбе. Момант гэтай барацьбы павінен прасякнуць усю навуковую, навучальную і выхаваўчую дзейнасьць усіх працаўнікоў Пэдфаку. Прадстаўнікі гуманітарных і прыродазнаўчых навук абавязаны завастрыць сваю ўвагу на высьвятленьні антырэлігійных пытаньняў.

У гэтых мэтах трэба выкарыстаць матар'ял кожнай навукі.

Гісторык культуры ў сваіх навуковых працах, на лекцыях, на практычных заняткох павінен заўсёды [illegible] сьвятлюць, што рэлігія ў руках пануючых клясаў была зброяй эксплёатацыі і прыгнечаньня, што сыстэма рэлігійнага выхаваньня заўсёды была сыстэмай арганізаванага ашуканства ў мэтах сацыяльнага ўціску.

Ад гісторыка культуры ня можа адставаць таксама фольклёрысты і літаратуразнаўца. Народная творчасьць уяўляе сабой довад таго, як у сялянскіх колах, ня гледзячы на ўсе патугі царквы прышчапіць ім нявольніцкую хрысьціянскую мараль, быў жывы здаровы клясавы інстынкт, які вылявіўся ў вялікай колькасьці сатыр на папоў, ксяндзоў і рабінаў, дзе выкрываецца хціваасьць, сквапрасьць на грошы, распуста і паразітызм гэтых прадстаўнікоў бога. Гэты фольклёрны матар'ял можна з посьпехам выкарыстаць у антырэлігійных мэтах. Вялікі ўдзячны матар'ял дае антырэлігійніку гэтаксама і мастацкая літаратура, асабліва нашага часу. Яна ў жывых вобразах выкрывае агідную ролю папоўшчыны, усю шкадлівасьць рэлігійных забабонаў. Выкарыстоўваньне мастацкай літаратуры дзеля барацьбы з рэлігіяй асабліва пажадана таму, што с р о д к а м і ж ы в ы х вобразаў можна, як вядома, уплываць ня толькі на розум, але і на пачуцьцё і ваабражэньне аўдыторыі, у выніку чаго антырэлігійны эфэкт будзе больш моцным і ўсеахапляючым.

Ня прыходзіцца асабліва гаварыць аб ролі выкладчыкаў прыродазнаўчых навук на фронце антырэлігійнай барацьбы,—яны павінны займаць самыя адказныя вучасткі гэтага фронту. Сучаснае прыродазнаўства ў грунце падрывае ўсе падставы рэлігійнага сьветапогляду, выкрываючы, напрыклад, дзіцячую наіўнасьць біблійных лягэнд аб пахаджэньні сьвету, жыцьця і чалавека. Прыродазнаўца можа быць асабліва карысным у справе замацаваньня навуковага матарыялістычнага сьветапогляду і разбурэньня рэлігійна-містычных забабонаў.

Але, зразумела, роля пэдфаку ў антырэлігійным змаганьні ня можа абмежавацца толькі ўнутрыунівэрсытэцкай дзейнасьцю. Гэта толькі адзін, да пэўнай ступені, акадэмічны бок справы. А барацьба з рэлігіяй—перш за ўсё справа грамадзкая. Пэдфак павінен прыняць самы шырокі і чынны ўдзел у вялікім пэдагагічным працэсе перавыхаваньня мас у антырэлігійным напрамку. Наладжваньне лекцый, дыспутаў, дакладаў адпаведнага характару, праца ў рабочых клюбах, выезды на вёску, у правінцыю—вось неабходныя спосабы арганізацыі гэтага вялікага пэдагагічнага працэсу. Адносная вага ў ім пэдагагічнага факультэту можа быць вельмі значная, бо пэдфак уяўляе сабой гарманічны сымбіёз навук гуманітарных і прыродазнаўчых. Займаючы розныя пазіцыі, і гісторыка культуры і прыродазнаўцы, пэдфак павінен з цяжкіх гарматаў навукі разьвіць гураганны агонь па рэлігіі і царкве. І тады кананада гэтых гарматаў заглушыць гнусавы царкоўны звон, сьветлае полымя навукі разгоніць жудасныя здані рэлігійнага змроку.

Дэкан пэдагагічнага факультэту праф. ПІОТУХОВІЧ.

Вынікі антырэлігійнай працы.

(Аршаншчына, Копыскі р.).

Антырэлігійная праца у м. Старасельлі ідзе шпаркімі крокамі ўперад. Гурток бязбожнікаў Старасельскай школы стала працуе і ўсе больш і больш прымае ў свае шэрагі бязбожнікаў. Асабліва інтэнсыўна была яго праца на працягу апошняга месяца.

На бацькоўскім сходзе быў зроблен даклад аб вялікадні і сьвяце 1-га мая. Даклад зацікавіў насельніцтва. Сход бацькоў і прысутнічаўшыя сяляне пастанавілі ня прымушаць сваіх дзяцей хадзіць у царкву у рэлігійныя сьвяты. Два антырэлігійных вечары, зробленыя ў «чысты» чацьверг і «вялікую» суботу прайшлі добра, прыцягнуўшы ўсю моладзь і значную частку старых.

Як адмоўны бок у антырэлігійнай працы, трэба адзначыць слабое распаўсюджваньне неантырэлігійнай літаратуры.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Эканамічнае Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра парадак выдачы дазволу на пабудову, пераабсталяваньне і рамонт млынавых прадпрыёмстваў.

1. Пабудова новых, а таксама пераабсталяваньне з простага на сартавы памол існуючых млыноў, даабсталяваньне і капітальны рамонт іх з заменай рухавікоў, а таксама і машын, якія размолваюць, перасяваюць і адвяваюць, пры ўсякай іх вытворчасьці,—можа рабіцца толькі з дазволу Народнага Камісарыяту Гандлю БССР і яго мясцовых органаў.

2. Дазвол на пабудову, пераабсталяваньне і рамонт (п. 1) млыноў, а таксама пуск у ход існуючых млынавых прадпрыёмстваў, якія належаць дзяржаўным, канцэрацыйным, грамадзкім арганізацыям і прыватным асобам, выдаецца: у адносінах да млыноў таварнага і паўтаварнага тыпу—Народным Камісарыятам Гандлю па ўзгадненьні з Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі, а ў адносінах да млыноў сялянскага тыпу—акруговымі інспэкцыямі гандлю з санкцыяй адпаведнага акруговага выканаўчага камітэту.

3. Млынамі сялянскага тыпу лічацца тыя, што маюць ня больш трох жарнавых паставаў альбо двух пар вальцаў, абслугоўваюць пераважна памольшчыкаў-спажыўцоў, незалежна ад месца знаходжаньня млына і роду рухавіка; млыны, якія маюць звыш трох жарнавых паставаў альбо 2 пар вальцаў, пераапрацоўваюць збожжа пераважна для гандлёвых мэтаў, лічацца млынамі таварнага тыпу.

4. Пры даабсталяваньні прыватных млыноў іншымі відамі вытворчасьці (лесапілкі, воўначоскі і іншыя) дазвол на даабсталяваньне іх павінен быць атрыман ад адпаведнага акруговага выканаўчага камітэту.

5. З выданьнем гэтай пастановы касуецца пастанова за 15 верасьня 1926 г. аб увядзеньні сыстэмы дазволу на пабудову і пераабсталяваньне млыноў

Старшыня Эканамічнае Нарады пры СНК БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **В. Крывіцкі.**

15 мая 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Экономического Совещания при СНК БССР

о порядке выдачи разрешений на постройку, переоборудование и ремонт мельничных предприятий.

1. Постройка новых, а равно переоборудование с простого на сортовой помол существующих мельниц, дооборудование и капитальный ремонт их с заменой двигателей, размалывающих, просевательных и отвевающих машин при всякой производительной мощности их может производиться только с разрешения Народного Комиссариата Торговли БССР и его местных органов.

2. Разрешения на постройку, переоборудование и ремонт (п. 1) мельниц, а равно и пуск в ход бездействующих мельничных предприятий, принадлежащих государственным, кооперативным, общественным организациям, а равно и частных лицам—даются в отношении мельниц товарного и полутоварного типа—Народным Комиссариатом Торговли, по согласованию с Высшим Советом Народного Хозяйства, а в отношении мельниц крестьянского типа—окружными инспекциями торговли с санкцией подлежащего окружного исполнительного комитета.

3. Мельницами крестьянского типа считаются мельницы, имеющие не больше трох жерновых поставов или двух пар вальцев, обслуживающие преимущественно помольников-потребителей, независимо от места нахождения мельницы и рода двигателя; мельницы, имеющие свыше 3 жерновых поставов или 2 пар вальцев, перерабатывающие зерно преимущественно для торговых целей, считаются мельницами товарного типа.

4. При дооборудовании частновладельческих мельниц другими видами производства (лесопилки, волночески и др.) разрешение на устройство этого дооборудования должно быть получено от подлежащего окружного исполнительного комитета.

5. С изданием настоящего постановления отменяется постановление от 15 сентября 1926 г. о введении разрешительной системы на постройку и переоборудование мельниц.

Председатель Экономического Совещания при СНК БССР **М. Карклин.**

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **В. Кривицкий.**

15 мая 1929 г.
г. Минск.

У прэзыдыуме ЦСПСБ.

ПРАВІЛЫ І НОРМЫ ПРЫЁМУ У ФАБЗАВУЧЫ.

Сёлета ў школы фабзавуч мэталістаў будзе прынята 45 чал. шрэйнікаў у Менску—60 чал. і у Віцебску—65 чал., скурнікаў—30 чал., абутнікаў—40 чал., дрэваапрацоўчнікаў—50 чал., ільна-прадзільай—60 чал., папернікаў—50 чал., стройвуч—50 чал. і нарахарчаваньня—25 чал.

Прэзыдыум ЦСПСБ зацьвердзіў гэтую норму прыёму ў школы фабзавуч, а таксама зацьвердзіў і правілы прыёму,

Узрост паступаючых у школы фабзавуча вызначан у 15 год для школ з 3-х гадовым курсам навучаньня і 16 год—з 2-гадовым.

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ МЕСЦ НА РАБФАКІ.

Сёлета на ўсе рабфакі БССР будзе прынята 191 чалавек. На кожнае месца будзе выдавацца па 2 камандыроўкі.

Прэзыдыум ЦСПСБ зацьвердзіў разьмеркаваньне гэтых месц на акругах і па саюзах чыгуначнікаў, хімікаў, папернікаў і тэкстыльшчыкаў у цэнтралізаваным парадку.

БІБЛІАТЭЧНЫЯ КУРСЫ.

Прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў пытаньне аб арганізацыі ўсебеларускіх курсаў па перападрыхтоўцы бібліятэчных працаўнікоў. Курсы меркавалася адчыніць на 58 чал., а пакуль запісалася каля 40.

У праграме апрача спэцыяльных пытаньняў, адведзена месца беларускай і расейскай літаратуры, а таксама прапрацоўцы пастаноў 16 партканфэрэнцыі. Курсы адчыняюцца 1 чэрвеня.

Прэзыдыум ЦСПСБ згадзіўся з праграмай і арганізацыяй курсаў. Саюзам, якія маюць бібліятэкараў, запрапанавана іх камандыраваць на курсы.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ У ВНУ.

Нам. Наркамасьветы т. Слонім інфармаваў прэзыдыум ЦСПСБ аб правілах прыёму ў ВНУ у 1929 годзе.

Прэзыдыум у асноўным згадзіўся з прынцыпамі і ўмовмі прыёму і ўнёс у іх шэраг паправак. Разам з гэтым даручана прафсаюзным арганізацыям сваечасова вылучыць прадстаўнікоў у прыймовыя камісіі ўсіх навучальных устаноў БССР Прэзыдым ЦСПСБ зьвярнуў увагу прафарганізацый на неабходнасьць больш асьцярожнага падыходу пры заверцы анкет паступаючых.

Праверка дагаворнай кампаніі сярод батрацтва.

Усе члены прэзыдыуму ЦП саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых выехалі ў розныя акругі БССР для праверкі ходу кампаніі сярод батрацтва. Побач з гэтым яны праверяць выкананьне калдагавораў па сплаве, азнаёмяцца з папярэдзімі вынікамі практычнай прафработы сярод сплаўшчыкаў і з вытворчай работай на мясцох.

ХРОНІКА.

У калегіі Наркамасьветы.

Пабудова новага кіно-тэатру.

Калегія Наркамасьветы зацьвердзіла плян і праэкт пабудовы на месцы былой „Чырвонай Зоркі" новага кіно-тэатру.

Белдзяржкіно дадзена ўказаньне скончыць гэту пабудову да восені бягучага году. Пабудова тэатру будзе каштаваць каля 320.000 руб.

Рэарганізацыя мастацкага тэхнікуму.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла рэарганізаваць Віцебскі мастацкі тэхнікум. З наступнага вучэбнага году ў тэхнікуме будзе арганізавана 2 аддзяленьні—пэдагагічнае і ганчарна-керамічнае. Галоўмастацтву даручана прапрацаваць пытаньне аб арганізацыі дэкаратыўнага аддзяленьня. У наступным годзе тэхнікум будзе працаваць у Віцебску. Галоўмастацтву даручана ўзьняць хадайніцтва перад Савнаркомам аб водпуску сродкаў для пабудовы будынку мастацкага тэхнікуму ў Менску.

Да арганізацыі вышэйшай мастацкай навучальнай установы.

Калегія Наркамасьветы прызнала неабходным арганізаваць у Менску вышэйшую мастацкую навучальную ўстанову. Тэрмін адчыненьня гэтай установы даручана прапрацаваць Галоўмастацтву.

Дэманстрацыя самарцаў.

24 мая на Чырвонаармейскім пляцы адбылася дэманстрацыя часьцей №-скай Самарскай дывізіі. Тут-жа быў арганізаваны лятучы мітынг, на якім прысутнічалі т. т.: Джэксон, Сянкевіч, Сташэўскі, Рабіновіч і Цэнцыпер.

Учора раніцой на іпадроме былі арганізаваны конскія скачкі; увечары ў садзе „Прафінтэрн" для чырвонаармейцаў дывізіі было наладжана гуляньне.

Новая кушнерная фабрыка Белшвэйтрэсту.

Белшвэйтрэст парашыў аб'яднаць усе разькіданыя кушнерныя цэхі, якія абслугоўваюць мехавымі фабрыкатамі нашы швальныя фабрыкі (Меншвэй, Вітшвэй, Гомшвэй) у адну фабрыку.

Дырэктарам новай фабрыкі вызначан тав. Альшэнбаум — рабочы-вылучэнец з фабрыкі „Меншвэй", які выявіў сябе на раней займаемых пасадах таленавітым кіраўніком.

Новая фабрыка будзе адчынена гэтым, летам, дзе будзе на першы час працаваць 150 чалавек рабочых-кушнераў.

З прычыны недахопу ў Менску дачатковай лічбы добра кваліфікаваных рабочых-кушнераў, прыдзецца запрасіць рабочых гэтай галіны в іншых гарадоў.

Зьняты з дапамогі за адмаўленьне ісьці на работу.

Прэзыдыум ЦП саюзу хімікаў разглядаў пытаньне аб беспрацоўных членах саюзу Паўловіч і Грыб, якія адмовіліся ад работы на запалкавай фабрыцы „Дняпро", куды іх накіроўваў саюз.

Пастаноўлена пазбавіць Паўловіча і Грыба права атрымліваць дапамогу, з папярэджаньнем, што ў выпадку другога адмаўленьня ад работы будзе ўзьнята пытаньне аб выключэньні іх з членаў саюзу.

Антысэміт Берасьневіч выключан з саюзу.

Беспрацоўны член саюзу савгандальслужачых гр. Берасьневіч у часе працэсу па справе работніцы т. Баршай у сяречках аб сутнасьці гэтага працэсу выявіў сябе, як злоснага антысэміта.

ЦП саюзу савгандальслужачых правяло расьсьледваньне, якое поўнасьцю пацьвердзіла факт антысэмітызму.

Пастаноўлена антысэміта Берасьневіча выключыць з шэрагаў саюзу, аб чым паведамлена біржы працы і рабочкам Універсытэцкага Гарадка, дзе ён зараз працуе.

Камісіі па нагляду за рамонтам у прыватных дамах.

Заўтра, 22-га мая, у жыльлёва-будаўнічай сэкцыі Менгарсавету будуць рабіць справаздачы рабочыя брыгады аб выніках абследаваньня жыльлёвага пляну. Адначасова з гэтым узьнімаецца пытаньне аб арганізацыі камісій в кватэрантаў, якія жывуць у 30-ці проц. нормах прыватных дамоў. Гэтыя камісіі будуць назіраць за правільнай аплатай і за выпаўненьнем усіх рамонтаў.

Пачаліся сходы пайшчыкаў акрсельбанкаў.

Зараз па ўсіх акругах БССР пачаліся сходы пайшчыкаў акрсельбанкаў. Дня ўдзелу ў сходах выехалі на месцы старшыня праўленьня Белсельбанку т. Ластоўскі і намеснік яго т. Матусэвіч.

Перасяленьне рамесьнікаў на Далёкі Усход.

З БССР на Далёкі Ўсход сёлета мае перасяліцца да 1000 розных рамесьнікаў і рабочых прамысловых прадпрыёмстваў. Групы перасяленцаў будуць накіроўвацца непасрэдна з акруг.

Перабсталяваньне саду хімікаў.

ЦП саюзу хімікаў адпусьціла 1000 руб. на перабсталяваньне летняга саду пры заводзе „Пралетары". Летні сад ужо адчыніўся; уся культасьветная масавая праца сярод рабочых заводу перанесена ў сад.

Замест „божа-цяла"—маёўка.

2-га чэрвеня ў дзень каталіцкага сьвята „божа-цяла" польскі клюб імя Розы Люксэмбург, і супольна з бацькамі-прадстаўнікамі ў школьных саветах школ сацвыхаванцаў, наладжвае масавую экскурсію-маёўку за горад. У маёўцы прымуць удзел сябры клюбу, рабочыя заводаў і вучні школ разам з бацькамі. Ужо закуплены тры цягнікі вузкакалейкі „Эльводу", каб перавезьці ўдзельнікаў маёўкі за горад. З экскурсіяй едуць 2 аркестры музыкі, і буфэт МЦРК, разьлічаны на 1500 чалавек. На месцы маёўкі будуць наладжаны розныя гульні, спартыўныя выступленьні і г. д. Сродкі на правядзеньне экскурсіі-маёўкі часткова адпушчаны культаддзелам ЦСПСБ.

Пашкоджаньне грушавых насаджэньняў.

Водлуг вестак Наркамзему ад вялікіх марозаў сёлета павымярзала да 50 проц. усіх груш. Найбольш пацярпелі ад марозаў гатункі—„Лесная красавица" бэры розныя, за выключэньнем „слуцкай". Усюды добра захаваліся дрэвы „сапежанак".

ВЫВУЧЭНЬНЕ АСАБЛІВАСЬЦЯЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ У ЛАТВІІ.

Беларуская Акадэмія Навук камандыруе сёлета ў Латвію праф. Бузука дзеля вывучэньня асаблівасьцяй беларускае мовы беларускага насельніцтва Латвіі.

Перападрыхтоўка настаўнікаў вёскі.

Для азнаямленьня настаўнікаў з мэтадам выкладаньня сельска-гаспадарчых дысцыплін у школах Гомельскі акр. аддзел нар. асьветы арганізаваў курсы пры Суткаўскай школе сялянскай моладзі. Для выкладаньня на курсах запрошаны прафэсары Беларускай С.-Г. Акадэміі і мясцовыя спэцыялісты па сельскай гаспадарцы.

Адначасова курсанты будуць весьці практычнае краязнаўчае вывучэньне райёну.

Патрабуюцца 300 рабочых для пасылкі на будаўнічыя работы.

На панядзелак 27 мая патрабуецца 300 чалавек рабочых для пасылкі іх на сэзонныя будаўнічыя работы. Пасылацца будуць са ўсіх сэкцый.

Беспрацоўныя, якія лічацца на вучоце чорнарабочай сэкцыі, павінны зьявіцца ў сваю сэкцыю роўна а 8 гадзіне раніцы.

Прагулы па няўважлівых прычынах зьмяншаюцца.

На 25 самых буйных прадпрыёмствах дрэваапрацоўчнай прамысловасьці ў першым паўгодзьдзі г. г. было прагулаў па розных прычынах 40759 рабочых дзён.

Пераважная колькасьць прагулаў прыпадае на навыхады на работу па хваробе. Колькасьць прагулаў па няўважлівых прычынах летась складала за год 7294 рабочых дзён, а за 6 месяцаў гэтага году толькі 2595.

Прэзыдыум ЦП саюзу дрэваапрацоўчнікаў, абгаварыўшы гэта пытаньне, даў дырэктывы ўзмацніць працу па барацьбе з прагуламі і выявіць, за рахунак якіх груп рабочых на некаторых прадпрыёмствах пазлічыліся прагулы.

З'эканомілі за год 100000 р.

У выніку перагляду норм выпрацоўкі і расцэнак, які быў праведзен на прадпрыёмствах дрэваапрацоўчнай прамысловасьці, толькі на 25 фабрыках і заводах з'эканомлена за год да 100.000 р.

На будаўнічых работах занята да 30.000 рабочых.

У сучасны момант шырока разгарнулися будаўнічыя работы ва ўсіх акругах БССР. Усяго на работах занята да 30.000 рабочых, з якіх да 18.000 членаў сяюзу.

Пакуль што ёсьць яшчэ беспрацоўныя сярод маляроў і інш. груп.

Пабудова рабочай амбуляторыі.

Гарсавет пастанавіў пабудаваць на Нова-Маскоўскай вуліцы новую рабочую амбуляторыю, разьлічаную на абслугоўваньне 600 хворых у дзень.

Памяшканьне для амбуляторыі будзе 2-хпавярховае, пабудова яго будзе каштаваць 75.000 руб.

У польскім вандроўным тэатры.

У драматычнай студыі дзяржаўнага польскага вандроўнага тэатру заканчываюцца тэарэтычныя заняткі. 1 чэрвеня ўжо пачнецца практычная праца па падрыхтоўцы рэпэртуару. У студыі займаецца 25 чалавек—выключна рабочая моладзь.

15 жніўня польскі вандроўны тэатр выяжджае ў першае падарожжа для абслугоўваньня сялянства польскіх сельсаветаў.

У БЕЛСЕЛЬБАНКУ.

Белсельбанк перавёў у акругі 42.000 руб. на земляўпарадкаваньне яўрэйскага насельніцтва.

Адпушчана акрсельбанкам 115.000 р. на крэдытаваньне бядняцкіх гаспадарак пры пераходзе іх у калгасы і для ўзмацненьня фондаў беднаты.

Белсельбанк адпусьціў 15.600 руб. на разьвіцьцё ячэйка-птушынай справы і 4500 руб. на арганізацыю пунктаў для адкорму гусей.

У ПАНЯДЗЕЛАК 27 МАЯ Ў БУДЫНКУ КІНО «ЮНЫ ПІАНЭР» (САВЕЦКАЯ 87) АДБУДЗЕЦЦА ДЫСПУТ НА ТЭМУ: „ВОПЫТ ПРАЦЫ І ЗАДАЧЫ ДЗІЦЯЧАГА КІНО".

Уступнае слова нам. загадчыка Белдзяржкіно т. Матусава. Білеты дасылаюцца па арганізацыях і школах.

УВАГА: па прычыне малай колькасьці месц у кіно, просьба да т. т., якія атрымаюць білеты, правесьці па магчымасьці гутаркі па школах і піанэр-атрадах аб працы дзіцячага кіно. Пачатак а 3 гадзіне ўвечары.

БЕЛДЗЯРЖКІНО.

ЗЬЛЁТ ПІАНЭРАЎ.

З 1 чэрвеня да 1 жніўня будзе праводзіцца ўсебеларускі зьлёт піанэраў.

У задачу гэтага зьлёту ўваходзіць: узьняцьце палітычнай актыўнасьці піанэраў ўсіх дзяцей працоўных, прыцягненьне ўвагі шырокай грамадзкасьці да задаволеньня здаровых запатрабаваньняў дзяцей па выхаваньні іх у камуністычным духу. У часе зьлёту будзе праводзіцца праверка ажыцьцяўленьня пастаноў УІІІ зьезду ЎсеЛКСМ і III пленуму ЦК камсамолу аб працы сярод дзяцей. Будзе таксама зьвернута вялікая ўвага на ўцягненьне ў шэрагі піанэраў новых мас дзяцей працоўных.

Наркамасьветы лічыць неабходным ахапіць зьлётам ня толькі піанэраў, але і ўсіх неарганізаваных школьнікаў. Інспэкцыям народнай асьветы запрапанавана ў канікулярны час прадастаўляць для арганізацыі дзіцячых канфэрэнцый, выставак, спэктакляў і для разьмяшчэньня дэлегатаў зьлёту памяшканьні і інтэрнаты навучальных устаноў. Дэлегаты зьлёту будуць абслугоўвацца кіно, летнімі садамі і тэатрамі.

Наркамасьветы даў указаньне, каб на мясцох праводзіліся сходы настаўнікаў масавых школ разам з піанэр-працаўнікамі для абмеркаваньня плянаў і праграм зьлёту піанэраў на мясцох.

ШАХМАТЫ № 18 (163).

Пад рэдакцыяй А. А. Каспэрскага.

Бел.—Багалюбаў—чорн.—Рэці.

(Нью-Ёрк у 1924 г.)

1. e2-e4 e7-6, 2. d2-d4 d7-d5, 3. Кb1-c3 Кg8-f6, 4. Сc1-g5 Сf8-b4, 5. Кg1-e2 ход новы, паказан Г. Вольфам і расцэнаван Багалюбавым. 5... d5:e4, 6. a2-a3 Сb4-e7, 7. Сg5:f6 Сe7:f6, 8. Кc3:e4 Сc8-d7, 9. Фd1-d3 Сd7-c6, 10. 0-0-0, Сc6:e4, 11. Фd3:e4 Фd8-d5, 12. Фe4-e3! 0-0, 13. Кe2-c3 Фd5-a5, 14. Кc3-e4 Кb8-d7, 15 h2-h4! Сf8-e7, 16. g2-g4 b7-b5 сваімі астатнімі ходамі Багалюбаў справацываў ход b7-b5, а пасьля гэтага ходу замест атакі на караля, пачынае гульню на ферзевым флянгу, 17. b2-b4! Фa5-b6, 18. Кe4-c5 Кd7:c5, 19. d4:c5 Фb6-b7, 20. Сf1-d3 a7-a5, 21. Фe3-e4!! Фb7:e4, 22. Сd3:e4 Лa8-d8, 23. c2-c3 a5:b4, 24. a3:b4 f7-f5, 25. g4:f5 e6-e5, 26. h4-h5 Сe7-g5 +, 27. Крc1-c2 Крg8-f7. 28. Сe4-c6 Крf7-f6, 29. Сc6:b5 Крf6:f5, 30. Сb5-c6 Крf5-e6, 31. f2-f3 Сg5-e7, 32. Лd1-a1 Сe7-g5, 33. Лa1-a7 Лf8-f7, 34. Сc6-e4 h7-h6, 35. Лh1-a1 Лd8-d2 +, 36. Крc2-b3 Сg5-d8, 37. b4-b5 Лf7-d7, 38. Лa1-a6 + Крe6-f7, 39. Сe4-f5 Лd7-e7, 40. c5 g6 + Крf7-f8, 41. Лa7-a8 Лe7-d7, 42. Лa6-c6 Лd7-e7, 43. Лe6-c6 Лe7-d7, 44. Лa8:d8 + Лd7:d8, 45. Лc6:c7 чорныя здаліся, бо пешкі белых ня могуць быць затрыманы.

Да матчу Алёхін—Багалюбаў.

Шахматысты цікавяцца, хто выйдзе пераможцам у матчы; амаль усе лічаць, што Багалюбаў ня здолее перамагчы Алёхіна, бо да гэтага часу ў турнірах ён заўсёды праігрываў Алёхіну: з 15 іграных імі партый Алёхін выграў 10, праіграў—2, а рэшта скончылася ў нічыю. Трэба, аднак, ведаць, што да матчу з Капабланкай, Алёхін шводкай партыі ня выіграў у Капабланкі, а ў матчы абыграў Капабланку, Багалюбаў, як і Алёхін, лепшы ігракі сьвету; матч між імі надта цікавы; хто пераможа — сказаць цяжка, бо калі Багалюбаў будзе гуляць у леташнім сваім стылі, дык перамога проекта немагчыма.

Даём адну з яго лепшых партый.

Папраўкі.

У № 116 нашай газэты—за 25 мая г. г.—ўкраліся памылкі. У арт. „Вясеньняя насеўная кампанія заканчываецца" надрукавана: „Хібы вытворчага каапэраваньня зімой і вясной павінны быць дапоўнены"... а трэба чытаць—„Хібы вытворчага каапэраваньня зімой і вясной павінны быць зьнішчаны дакладнай работай гэтым летам і ўвосень".

У арт. „Больш увагі жывёлагадоўлі"—3-ці стоўпік, 14-я стр. зьверху замест слова „да вясковае" павінна быць „да валавай", 3-ці стоўпік 16 стр. зьнізу—замест слова „зьніжэньне" павінна быць „палепшаньне", 7-ы стоўпік, 13 стр. зьверху—замест слова „вайсковы" павінна быць „вясковы".

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

Катыроўка пазык на 27 мая 1929 г.

	Пакуп.	Прад
1-я 6 проц. залат. выйгр. пазыка	4.92,5	—
2-я 6 проц. залат. выйгр. пазыка	5.00	—
Бяспрон. залат. выйгр. пазыка 1926 г.	125,75	127.75
10 проц. дзярж. выйгр. пазыка 1927 г.	25.74	25.84
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка індустр.	25,25	25.35
3-я сялянск. выйгр. пазыка 1927 г.	5.04.5	—
12 проц. дзярж. унутр. пазыка 1927 г.	105.87	—
2-я 6 проц. паз. проц. вып.	26.41	26.51
Пазыка індустр. бяспр.	.25.65	25.75
Дзярж. пазыка 29 г.	99.88	100.08

Апавяшчэньні.

— У нядзелю 2 чэрвеня арганізоўваецца маёўка-экскурсія працоўных палякаў г. Менску.

Разнастойная праграма: спартыўныя выпрэдмцтвы на прызы, стральба, футбол, баскет-бол, валей-бол, гарадкі лётары. Масавыя ігры.

Іграе духавы аркестр музыкі. Буфэт па танных цэнах, бясплатны праезд у Барвую са зваротам.

Запіс на маёўку-экскурсію праводзіць польскі рабочы клюб імя Р. Люксэмбург, у канцэляры 6-й і 33-й польскіх школ, а таксама вопытная школа пры польпэдтэхнікуме.

ПЭДГАБІНЭТ.

У панядзелак, 27 мая роўна а 7 гадзіне ўвечары сход сэкцыі антырэлігійнага выхаваньня.

Парадак дня:

1. Мэтодыка антырэлігійнага выхаваньня ў II групе (дак. з Цэнт. Дасьв. школы).
2. Антырэлігійная работа ў I школе (дакл. т. Гальчун). Яўка сяброў сэкцыі абавязкова. Запрашаецца наотаўніцтва.

У панядзелак, 27 мая роўна а 10 гадзіне раніцы канфэрэнцыя дакладчыкаў матэматыкі і фізыкі школ г. Менску.

Парадак дня:

1. Вынікі выкладаньня фізыкі і матэматыкі за год.
2. Праграмныя пытаньні.

Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Нядзеля, 26 мая

З прычыны шматлікіх запатрабаваньняў яшчэ раз АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ

ЗАПЯЮЦЬ ВЕРАЦЁНЫ

Білеты ў касе тэатру.)—(Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

ЛЕТНІ ТЭАТР „ПРОФІНТЭРН"

Нядзеля, 26 мая

Закрыты спэктакль для саюзу дрэваапрацоўнікаў і транспартнікаў

„КРАСНЫЙ МАК".

Пачатак а 8 з пал. гадз. увечары.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. — Прэм'ера, амэрыканскі баявік, адна з лепшых карцін усясьветнай кіноматаграфіі **„ЧАНГ".** Пачатак І сэансу а 9 г. увечары. Каса а 7 гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **„ПЛЁТКА".** Драма ў 7 частак. Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — **„ПРАВА НА ЖЫЦЬЦЕ".** Драма ў 6 частках. КІНО-ХРОНІКА „САВКІНО" № 202-23. Пачатак а 7 з паловай гадзіне. Каса а 6 гадзіне.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА" — З прычыны вялікага посьпеху яшчэ 6 дзён **„ВЯСЁЛАЯ КАНАРКА"**

Менскі Акрсавет Т-ва „Прэч няпісьменнасьць"

па дагаворанасьці з Культаддзелам ЦСПСБ, з мэтай барацьбы з рэцыдывам няпісьменнасьці, арганізоўвае для сяброў саюзу скончыўшых ліквпункты

2-х месячную агульна-гарадзкую школу

З БЕЛАРУСКАЙ І ЯЎРЭЙСКАЙ СЕКЦЫЯМІ.

СЯБРЫ САЮЗУ, ЯКІЯ ХОЧУЦЬ ПАСТУПІЦЬ У ГЭТУЮ ШКОЛУ, ПАВІННЫ ПА ДАЦЬ ЗАЯВУ Ў АКРСАВЕТ Т-ВА „П-Н" НЕ НАЗЬНЕЙ 10 ЧЭРВЕНЯ 1929 Г.

Гр. Дзяркач Нікалай Маркаў, які паходзіць з гр-н вёскі Чарнова Чэрвенскага раёну, Менскай акр. і жыве ў г. Чэрвені парадж. 1904 г., зьмяняе прозьвішча „Дзяркач" на прозьвішча „Цьвяткоў".

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча, просяць паведаміць аб гэтым Менскі Загс, паказаўшы сваё прозьвішча, імя, імя па бацьку і месца жыцьця.

Гр-н Каліта Грыгоры Кузьмаў, які паходзіць з гр-н Ур. Праворнае, Чэрвенскага р-ну, Менскай акругі і жыве ў г. Менску парадж. 1901 г., зьмяняе прозьвішча „Каліта" на прозьвішча „Кавалёўскі".

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча, просяць паведаміць Менскі Загс, паказаўшы сваё прозьвішча, імя, імя па бацьку і месца жыцьця.

Дом пісьменьнікаў (САВЕЦКАЯ, 68).

Сёньня 26 траўня а 7-ай гадзіне ўвечары АДБУДЗЕЦЦА гадавы літаратурны

СХОД „УЗВЫШША"

прысьвечаны трохгадовай працы згуртаваньня.

НА СХОДЗЕ БУДЗЕ:

1) УСТУПНАЕ СЛОВА—К. ЧОРНЫ.
2) ДАКЛАД ПРА ЎЗВЫШАЎСКУЮ ТВОРЧАСЬЦЬ—А. БАБАРЭКА.
3) БЕЛАРУСКІ АНАЛІТЫЧНЫ АЛЬФАБЭТ—ДАКЛАД УЛ. ДУБОЎКА,
4) ПРЫЁМ НОВЫХ СЯБРОЎ.

Запрашаюцца пісьменьнікі і чытачы. УВАХОД ВОЛЬНЫ. „УЗВЫШША".

ВЫШЛА З ДРУКУ,

РАССЫЛАЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ І ПРАДАЕЦЦА Ў КНІГАРНЯХ ЧАСОПІСЬ

№ 4 „УЗВЫШША" № 4

ЗЬМЕСТ:

Уладзімер Дубоўка.—Браніслава (поэма).
В. Шашалевіч.—Воўчыя ночы (драматычныя абразы).
М. Лужанін.—Мініятуры. Вясновы сяўнік (вершы).
А. Мрый.—Запіскі Самсона Самасэя (аповесьць).
Ул. Хадыка.—Трывожны шум (верш).
А. Бабарэка.—„Зямля" Кузьмы Чорнага.
Ів. Цвіткевіч.—Дзіцячая літаратура ў Японіі.
І. К. Кусік'ян.—Яфэтычная тэорыя.
Віт. Вольскі.—Да пытаньня пра спрошчанае азначэньне падвойных зычных на пісьме.
В. С--ч.—Чаго мы хочам ад пісьменьнікаў.
Ю. Грынкевіч.—Аб «Узвышшы» і дасужых крытыках.
С. Кулеш.—«Узвышша» на вёсцы.
П. Дубовік.—На прогрэсыўным шляху.
Ф. Купцэвіч.—«Сочинительство» ці творчасьць.
А. І. Барычэўскі.—Пра I том «Литературной Энциклопедии».
Л. Трыер.—„І бяз болю і бяз мукі" ці „Тое ўсе, што ў модзе".
А. Цітоў—Пра кніжку П. Панч „Голубі ешелоні".

ЯШЧЭ НЯ ПОЗНА ПАДПІСАЦЦА НА — ЧАСОПІСЬ — „УЗВЫШША" НА ЦЭЛЫ — ГОД —

Падпішчыкам высылаюцца ўсе нумары, пачынаючы з першага.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА на год . . . 5 руб., адзін паасобнік у продажы к. штуе 80 кап.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, Савецкая 68, Дом пісьменьнікаў „УЗВЫШША".

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС СЬМІЛАВІЦКАГА РАЙКАМБІНАТУ

на 1 кастрычніка 1928 г.

АКТЫЎ

НАЗВА РАХУНКАЎ	Паасобная сума	Агульная сума
I. МАЁМАСЬЦЬ:		
1) будынкі і пабудовы	28928—67	
2) Машыны і абсталяваньне	28277—72	
3) Інвэнтар і інструманты	3033—53	60239—92
II. Незакончаныя будынкі і абсталяваньне		3651—28
III. Незаконч. грунтоўн. будаўніцтва		1055—31
IV. МАТАР'ЯЛЫ:		
1) Асноўны матар'ял	595—13	
2) Апал	321—76	
3) Дапаможныя матар'ялы	509—25	
4) Будаўнічыя матар'ялы	1294—65	2720—79
V. НЕЗАКОНЧАНАЯ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ:		
1) Незаконч. вытворчасьць	75—30	
2) Паўвырабы	1361—32	1436—62
VI. ТАВАРЫ І ГАТОВЫЯ ВЫРАБЫ:		
1) Тавары і гатов. вырабы на складзе	3135—57	
2) Прадукты	414—90	3550—47
VII. ГРАШОВЫЯ СРОДКІ:		
1) Каса	2126—33	
2) Бягучыя рахункі	1765—32	3891—65
VIII. Падсправаздачныя сумы		850—59
IX ДЭБІТОРЫ:		
1) Рабочыя і служачыя	150—62	
2) Дастаўнічыкі і падрадчыкі	821—26	
3) Пакупнічыкі і заказчыкі	813—12	
4) Дэбіторы розныя	1159—81	
5) Пазыкаўныя дадзеныя	1146—16	
6) Сьмілавіцкі РВК па адліч. ад прыбытку	3318—36	7409—33
X. Выдаткі будучых гадоў		1619—05
БАЛЯНС		86425—01

НАЗВА РАХУНКАЎ	Паасобная сума	Агульная сума
I. КАПІТАЛЫ:		
1) Статутны	60239—92	
2) Зваротны	78—84	
3) Амартызацыйны	1249—00	
4) Рэзэрвовы капітал	899—39	62467—15
II. ФОНДЫ:		
Фонд палепшаньня быту рабочых		899—39
III. РЭЗЭРВЫ:		
Рэзэрв няпэўных даўжнікоў		1146—15
IV. ССУДЫ І КРЭДЫТОРЫ:		
1) Ссуды з прам. фонду	9037—19	
2) Таксама доўгатэрміновы на гаспадарчыя патрэбы	3100 —	12137—19
V. КРЭДЫТЫ:		
1) Рабочыя і служачыя	203—51	
2) Дастаўнічыкі і падрадчыкі	840—65	
3) Райвыканком Сьмілавіцкі	2116—69	
4) Неаплачаныя падаткі і сац. ўзн	1370—80	
5) Розныя крэдыторы	410—33	4941—38
VI. ВЫНІКІ:		
Прыбытак за справаздачны 1927-28 бюдж. год		4833—14
БАЛЯНС		86425—01

ПАСЫЎ

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ

ДЭБЕТ

1) Страта ад выкананьня работ (лазьня)	338—46
2) Гандлёвыя выдаткі	1354—64
3) Агульна-адміністрацыйныя выдаткі	1976—27
4) Страта ад недахопу матар'ялаў, паўвырабаў і тавараў	59—07
5) Адлічэньні ў рэзэрв няпэўных даўгоў